Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСКА-КУЛЬТУРНАГА ТАВАРЫСТВА

№ 41 (1076) БЕЛАСТОК 10 КАСТРЫЧНІКА 1976 г. ЦАНА 60 гр.

Працоўны і жыццёвы шлях **Веры Рышчук** — настаўніцы беларускай мовы ў Бельскім беларускім ліцэі — вельмі паказальны для большасці педагогаў з нашага асяроддзя.

Ці чулыя адносіны першай настаўніцы Т. Кудрыцкай, ці ўплыў вершаў і апавяданняў аб высакароднай працы выхавацельніцы самых маленькіх, а можа пад уплывам аднаго і другога вясковае дзяўчо са Шчытоў, што каля Орлі, пасля заканчэння пачатковай школы падалося ў Педагагічны ліцэй для выхавацельніц дзіцячых садоў у Бельску. Тут колішняе дзіцячае жаданне перарадзілася ў трывалае і мэтанакіраванае імкненне стаць педагогам.

Пасля гадавога кваліфікацыйнага педагагічнага курса ў Элку В. Рышчук уступае на свой працавіты настаўніцкі шлях. Вядзе ён праз вясковыя школкі ў Сацах і Плянтах на Гайнаўшчыне, Пасынках на Бельшчыне, надзвычай цяжкую і адказную працу ў спецыяльных класах у пачатковай школе № 2



З улюбёнасцю да роднай мовы

у Бельску, светлыя дні і гады ў славутай бельскай беларускай пачатковай школе № 3 і вось ужо чацвёрты год — у Бельскім беларускім ліцэі.

Нехта заўважыць з папрокам: „І пашто гэтакае валэнданне? Ці не прасцей было адразу закончыць вышэйшую школу і адразу стаць за прафесарскім сталом у ліцэі?“ Не, напэўна не! Праца ў пачатковых школах у самых разнастайных асяроддзях дала ёй тое, чаго не можа даць ніводная вышэйшая школа — самае каштоўнае ў педагогіцы, а іменна: усебаковы багаты вопыт працы з маладым пакаленнем і вёскі і горада. Яго В. Рышчук скрупулёзна канфрантавала і канфрантуе з педагагічнай тэорыяй. Яна належыць якраз да тых настаўнікаў, якія няспынна паглыбляюць свае веды і павышаюць кваліфікацыі. Закончыла беларускую філалогію ў Завочнай настаўніцкай студыі ў Беластоку, ужо тры разы ўдзельнічала ў курсах настаўнікаў беларускай мовы ў Мінску, а цяпер яна — студэнтка чацвёртага курса беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта. Вось так іменна фармуецца высокакваліфікаваны педагог, спецыяліст па роднай мове!

— Побач са шматлікімі іншымі важнымі дзялянкамі працы з вучнямі, я многа ўвагі адводзіла раней і адводжу цяпер справе ўвядзення ў беларускую мову тых, хто яе не вывучаў, або нават і не чуў, — расказвае В. Рышчук. — Дзеля гэтага я прадумвала дэталёва кожнае сваё слова, кожнае практыкаванне ў класе ці хатняе заданне, ставячы пры гэтым дзве асноўныя мэты: першая — зацікавіць беларускай мовай і прывіць замілаванне да яе; другая — навучыць, як карыстацца беларускай мовай, узбагаціць актыўны слоўнік вучня, а таксама пазнаёміць з багатай літаратурай і культурай нашага народа. Ці прыходзіла мне гэта лёгка? О, не! У пачатковай школе даводзілася гэта рабіць адначасова з працай з усім класам, які ўжо валодаў пэўнай сумай ведаў па роднай мове. Таму з такімі вучнямі я працавала індывідуальна, паволі, цярпліва і, скажу шчыра, з добрымі вынікамі. Самым жа вялікім для мяне задавальненнем было, калі такі вучань глыбока палюбіў беларускую мову і пайшоў далей вучыцца ў беларускі ліцэй. А такіх было ў мяне шмат. А вось у ліцэі мы штогод арганізоўваем для вучняў, якія не ведаюць беларускай мовы, спецыяльны паўгадовы ўводны курс у часе іх вучобы ў першым класе. Пачынаю, звычайна, з самых простых сітуацыйных гутарак на беларускай мове. Выкарыстоўваю да іх спецыяльныя карцінкі, а нават арганізую інсцэнізацыю ў класе. Вельмі добрым дапаможнікам з'яўляюцца для нас пласцінкі з запісамі выказванняў пісьменнікаў і дзеячоў культуры Савецкай Беларусі. Затым я прыступаю да беларускага алфавіта, чытання і пісання. І тут таксама адводжу шмат месца жывому беларускаму слову: чытанню апавяданняў, артыкулаў і вершаў не толькі ў маім выкананні, але і аднакласнікаў маіх навучэнцаў, што добра валодаюць роднай мовай. І вось так, крок за крокам, мы ўваходзім у багаты свет

нашай беларускай мовы і культуры, каб праз чатыры працавітыя гады вучобы ў ліцэі былога ўдзельніка ўводнага курса з-пад яго пяра выйшла сачыненне на беларускай мове на атэстат сталасці на 6-10 старонках вялікага фармату, з выказанымі ў ім глыбокімі ведамі па беларускай літаратуры і без адзінай памылкі. А гэта бывае надта часта...

Шмат цікавага расказвае В. Рышчук і аб выкарыстанні ў навучанні роднай мове месячніка „Беларусь“, тыднёвіка „Ніва“, часопісаў „Маладосць“ і „Полымя“. Усё гэта толькі пацвярджае тое, што яна выкарыстоўвае ўсе даступныя настаўніку дапаможнікі дзеля прывівання моладзі ўлюбёнасці і глыбокіх ведаў па роднай беларускай мове.

М. Гайдук
Фота аўтара



Ля Дома настаўніка ў Гайнаўцы. Выстаўка прац мастакоў сёлетняга гайнаўскага разбярскага пленеру.
Фота Я. Цялушэцкага.

Новыя вершы

Пажыць да дна — і кропка, годзе.
У чым жа справа?
Усё запознена прыходзіць:
Набытак, слава.

Той славы з макавае зерне,
На грош набытку.
А маладосць ужо не вернеш,
Хіба што ў сшытку,

Дзе ты пракладваеш сцежкі
Зноў у былое.
А на цябе глядзіць з насмешкай
Жыццё жывое.

А што яму да ўспамінаў,
Да спавядання,
Што праляцелі недзе міма
Спадзяванні.

Ты добра жыў.
Чаго смуткуеш?
Не вер жэнь-шэню.
Жыццё працуе і святкуе,
І моладзь жэніць.

Ляціць яно па зорных трасах
І зырка свеціць.
Мы непрыгодны ў суддзі часу:
Яго мы дзеці.

Рук не шкадуючы, рабілі,
Жылі як людзі.
І не прасі, каб не забылі,
Лепш без ілюзій.

Глядзі без зайздрасці, як дораць
Дзяўчатам кветкі.
Спраў маладым няма да гора...
Ты сам быў гэткі.

Пімен Панчанка

Мэбля з Супраслі

Раней на гэтым месцы была тэкстыльная фабрыка, чаго апошнімі сведкамі з'яўляюцца комін вышынёй у сорак два з паловай метры і воданапорная вежа. Месца ранейшай фабрыкі заняў каапературыў па вытворчасці мэблі, які ў мінулым годзе святкаваў дваццаць пятую гадавіну свайго існавання. Пачаткова быў ён невялікі. Але амаль кожны год прыходзіў з нейкім прыбыткам і дзякуючы гэтаму мэбля цяпер родзіцца ў вялікіх прасторных залах, абсталяваных новымі машынамі. 1975 год таксама не прыйшоў з пустымі рукамі. Былі аддадзены ў карыстанне, пабудаваныя коштам двух мільёнаў злотых, сацыяльна-бытавыя памяшканні.

У каапературыве, дырэктарам якога ад 1969 года з'яўляецца Зыгмунт Зэмло, працуюць на дзве змены 204 працаўнікі, з чаго сорак працэнтаў гэта жанчыны. Што ж гэта за людзі? Пераважна маладыя ў поўнай вытворчай сіле. Сярэдні ўзрост у межах 30-32 год. Калі гаварыць аб іх падрыхтоўцы, то выглядае яна па-рознаму, так як па-рознаму выглядае вытворчасць, якая ідзе тут паточна. Хто клеіць, хто малюе, хто наводзіць паліту́ру, хто яшчэ нешта іншае робіць. Пакуль дрэва заменіцца ў стол, павінна яно прайсці вялікі шлях. Таму, зразумела, і падрыхтоўка павінна быць розная. Найбольш працаўнікоў закончыла розныя прафесіянальныя школы. Але ёсць і такія, якія прывучаюцца да працы тут. Дырэкцыя стварае для гэтага спрыяльныя ўмовы. Арганізуе курсы на званне чаляднікаа або майстра.

А цяпер пра галоўнае. Што ж за мэбля тут нараджаецца? Пераважна сталы. Не будзем доўга над гэтым затрымоўвацца, бо кожны дасканала ведае, як выглядае стол. Але нельга прамаўчаць пра стол-лаву даволі танны (1800 злотых) і надта зручны ў карыстанні. На першы позірк гэта зусім невысокі маленькі столічак. Але хопіць узяць яго толькі за верх і падняць ды рассунуць у бакі, як стаіць ужо звычайны, высокі стол. Добра! Апрача сталоў, робяць тут бібліятэчкі для кніг. Можна таксама тут нешта і заказаць. Прыкладна, стэлажы ці шафы. Праўда паслугі гэтыя разгорнуты не вельмі шырока, але ўсё ж такі два мільёны злотых, якія прызначаюць на гэта ў год, гэта не так ужо і мала.

Вернемся да вырабаў, якія з'яўляюцца пладамі паточнай вытворчасці. З Супраслі ідуць яны па цэлай краіне і карыстаюцца вялікай папулярнасцю з увагі на сваю якасць і невысокую цану.

— Што плануеце на будучыню? Можа прадбачаны нейкія змены ў вытворчасці? — звяртаемся да дырэктара.

— І так і не. Пры сталах застанемся далей, але частку з іх, згодна з дагаворам, будзем дадаваць да мэблевага камплекта „Беласток“. І так на наступны год падпісана запатрабаванне на 25 тысяч штук. Апрача гэтага заказалі ў нас 20 тысяч штук звычайных сталоў.

Гэта толькі тое, што робяць згодна з дагаворам. Апрача таго, ідзе і штодзённая вытворчасць. І так у год, калі возьмем усё разам, прадукцыйныя залы пакідае 60 тысяч штук рознай мэблі. Колькі ж на гэта трэба матэрыялу! Каапературыў па вытворчасці мэблі ў Супраслі абяспечваецца ім па-рознаму. Часткова бярэ ў мясцовым тартаку, часткова карыстае з дзяржаўных надзелаў, а часткова з імпарту з Савецкага Саюза. Праблемы ёсць. Часта адчуваецца недахоп матэрыялаў, і гэта адбіваецца на гадавых планах, а яны тут вялікія (каля пяцідзесяці мільёнаў).

— А як з працаўнікамі? — зноў звяртаемся да дырэктара.

(Працяг на стар. 2)

Незвычайная біяграфія звычайнага чалавека ● Рэпартаж з Вулькі Нурэцкай ● Беларускія трактары ● Інтэрв'ю ў прысутнасці аўтамата ● Беларускі фальклор ў „Песнях“ К. У. Вуйціцкага ● Перацёсы ● Як знайсці спосаб на „спосаб“ ● Весткі з Супраслі, Галадоў, Гайнаўкі, Белавежы, Дубіч Царкоўных, Вітава, Бельска, Кнаразоў, Крывяціч ● Калі сніцца бальніца ● Песня „Rysunek na szkle“.

КАРЭСПАНДЭНЦЫЯ З МІНСКА

У нашым дзіцячым садзе

З сардэчнай падзякай адклікаюцца аб працы дзіцячага сада № 64 маці-работніцы Мінскага вытворчага аб'яднання „Гарызонт". Тут дзеці выхоўваюцца ад года да сямі год, да паступлення ў школу. У гэтай дашкольнай установе 8 узроставых груп, кожная з іх размешчана ў ізаляваных між сабою прасторных і светлых групавых пакоях, з асобнымі спальнямі, пакоямі для гульняў і прыёмнымі — раздзявалкамі.

Акружаючая дзяцей абстаноўка дзіцячага сада мэтанакіраваная і прыгожая. Першае, што звяртае тут на сябе ўвагу, — гэта пастаянная чысціня і парадак, скромнасць абстаноўкі, няма тут непатрэбных аздоб, дакладна размеркаваны педагагічныя дапаможнікі.

Вельмі сур'ёзна падыходзіць калектыў да падбору дыдактычнага матэрыялу і матэрыялу для гульняў, да афармлення групавых пакояў. Абавязкова ўлічваюцца асаблівасці дзіцячага ўзросту і задачы выхавання, вызначаныя „Праграмай выхавання ў дзіцячым садзе".

Работу дзіцячага сада ўзначальвае Тацяна Бардукова — добры педагог, чулы таварыш і вялікі сябра дзяцей. Намаганні ўсяго калектыву яна накіроўвае на такую арганізацыю быту і жыцця дзяцей у дзіцячым садзе, пры якой ствараецца атмасфера дзіцячай радасці, добрых пачуццяў, выхоўваецца ў іх жаданне і ахвота да актыўнай дзейнасці — гульняў, працы, спецыяльных вучэбных заняткаў. Пры гэтым трэба адзначыць, што тут строга ўлічваюцца і індывідуальныя асаблівасці, і стан здароўя дзяцей. Загартоўванню дзіцячага арганізма ў гэтым калектыве ўдзяляецца самая сур'ёзная ўвага. Яно пачынаецца з першых дзён паступлення дзіцяці ў дзіцячы сад. Пад асобым кантролем лекара і медсястры знаходзяцца і зноў прынятыя дзеці, асабліва наймалодшага ўзросту. З дзяцьмі ад года да трох гадоў загартоўванне пачынаецца ад сістэматычнага правядзення паветранага рэжыму і прымянення аблегчанай вопраткі. Затым уводзяцца паветраныя ванны з паступовым абніжэннем тэмпературы, хаджэнне па рабрыстай дошцы боса, водныя працэдуры, масажы, карыгіруючая гімнастыка, якая садзейнічае выпраўленню правільнай паставы.

У выніку каардынаванай працы медыцынскага і педагагічнага персаналу ў дзіцячым садзе рэдка паяўляюцца інфекцыйныя і цяжкія прастудныя захворванні сярод дзяцей. Утрыманне дзяцей у дзіцячым садзе складае для бацькоў 1,5 працэнта ад сямейнага даходу, але не больш 12-ці рублёў у месяц. Астатнія выдаткі пакрываюцца прафсаюзамі.

Любіць свой дзіцячы сад, горад, у якім жывуць, умець сябраваць, дружна гуляць, быць уважлівым да дарослых і адзін да другога — вучацца малышы ад ранняга ўзросту. Не толькі на занятках, у быту, але і ў гульнях педагогі вучаць дзяцей праяўляць клопаты старэйшых аб малышах, адказна адносіцца да выканання даручэнняў. Гуляюць тут дзеці з захапленнем у гульні, вельмі разнастайныя па змесце і відах. Старэйшыя дзеці з задавальненнем выпрабляюць для малышоў цацкі (вяртушкі, лодачкі, біноклі, светафоры, домікі для гульняў з пяском). Шырока практыкуюцца ў дзіцячым садзе і канцэрты, спектаклі лялечнага тэатра, ранішнікі, дасугі.

У дзіцячым садзе існуе вельмі добрая традыцыя адзначаць дзень нараджэння кожнага дзіцяці. На гэты дзень дзеці старэйшай групы рыхтуюць самастойныя падарункі: прыгожы малюнак ці цацку — і ўрачыста ўручаюць іх малодшым таварышам. Гэта застаецца надоўга ў памяці дзяцей, садзейнічае выхаванню такіх маральных якасцей, як добразычлівасць, клапатлівасць і чуллівыя адносіны адзін да другога. Выхаваўцы вядуць дзяцей у цудоўны свет прыроды, прывіваюць ім любоў і клапатлівыя адносіны да яе; вучаць бачыць і адчуваць яе прыгажосць. Дзіцячы сад мае сваю дачу. Усё лета праводзяць дзеці на дачы дзіцячага сада ў жывапісным закутку леса ў 40 кіламетрах ад Мінска.

Выхаванкі дзіцячага сада вельмі любяць музычныя заняткі, якія праводзіць выкладчык музыкі і спеву з вышэйшай адукацыяй. Музыцы адведзена вялікае месца ў выхаваўчай працы з дзецьмі.

Сур'ёзна вырашае калектыў дзіцячага сада № 64 задачу падрыхтоўкі дзяцей да школы. У падрыхтоўчай групе на занятках па развіццю мовы і фарміраванні матэматычных уяўленняў выхаваўцы не толькі вучаць дзяцей спосабам практычнага дзеяння, аперацыям ліку, але і актывізуюць самастойную думку дзіцяці, вучаць устанаўліваць прычынныя сувязі паміж з'явамі. Дзіця сам год умее скласці творчае апавяданне, апавяданне па карціне з васьмі-дзесяці сказаў, звязна расказаць аб бачаным, умее зрабіць абагульненне.

Усю выхаваўчую працу з дзецьмі ў дзіцячым садзе вядуць кваліфікаваныя спецыялісты, майстры сваёй справы, маючыя вышэйшую спецыяльную адукацыю.

М. Алесава

Фота В. Казлова

Дзіцячая гульня „Гастраном".

ШТО НОВАГА?

ВОСТРЫЯ СІМПТОМЫ

У сучасным свеце, які хутка мяняецца, Новая Зеландыя заваявала сабе славу марудлівага фермера, які клапоціцца толькі аб сваёй гаспадарцы і знаходзіцца ў баку ад чужых клопатаў. Аднак больш блізкае знаёмства з гэтай невялікай астраўной дзяржавай падказвае, што тысячамільныя акіянскія прасторы не засцерагаюць яе ад няшчасцяў. Праўда, тут яны праяўляюцца часам са спазненнем. Цяпер, напрыклад, Новая Зеландыя перажывае вострыя сімптомы наркаманіі.

„Праблема наркаманіі набывае пагражальны выгляд", — палічыў неабходным папярэдзіць на пасяджэнні Вярхоўнага суда ў Велінгтоне суддзя Дж. Біці. Колькасць злачынстваў, звязаных з наркаманіяй, згодна з данымі міністра паліцыі А. Макрэдзі, павысілася ў Новай Зеландыі толькі за мінулы год на 30 працэнтаў. З'явіўся і новы від правапарушэнняў — аграбленні і ўзломы аптэк з мэтай крадзяжу наркотыкаў. Увагу грамадскасці прыцягнула заява галоўнакамандуючага новазеландскімі войскамі ў Сінгапуры генерала Р. Халоўэя аб тым, што сярод падначаленых яму ваеннаслужачых „наглядаюцца прыкметы наркаманіі". Новазеландскае міністэрства аховы здароўя вымушана было стварыць дзяржаўны камітэт для вывучэння праблемы, якая ўзнікла.

Цяпер, як заявіў міністр паліцыі, найбольш сур'ёзным з'яўляецца рост колькасці гераіну, увозімага кантрабандай у Новую Зеландыю. Толькі ў мінулым годзе было адобрана каля трох кілаграмаў гэтага наркотыку на суму 3-4 мільёны долараў. Для аддаленай краіны з насельніцтвам усяго тры мільёны чалавек гэта, на думку паліцыі, нямала.

Кіраўнік дэпартамента паліцыі Чэрчыль не выключае і таго, што Новая Зеландыя, акрамя ўсяго іншага, выкарыстоўваецца ў якасці перавалачнага пункта кантрабанды на шляху з Азіі ў Аўстралію і ЗША. Калі гэта так, праблема пагражае стаць яшчэ больш сур'ёзнай: „паток" наркотыкаў, які праходзіць праз краіну, садзейнічае іх даступнасці, а паліцыі даводзіцца мець справу далёка не з дылетантамі ў гэтай справе.

„Існуюць яўныя прыкметы арганізаванага распаўсюджвання наркотыкаў у краіне", — заявіў Макрэдзі. Але гэта праліў некаторае святло працэс над Джойс Ларсен, якая спрабавала разам з двума саўдзельнікамі пераправіць у Новую Зеландыю больш чым два кілаграмы гераіну. Пры вынясенні прыгавору суддзя выказаў думку, што „магчыма, да справы маюць дачыненне і іншыя асобы, якія засталіся па-за дасягальнасцю закона". Адна са сведак асуджаная ў свой час таксама за ўвоз і збыт наркотыкаў, назвала нейкіх інспектара паліцыі і адваката. Аднак даказаць іх дачыненне да справы не ўдалося. Сляды прывялі да Тэрэнса Кларка, які скрываецца пасля няўдалай спробы ўвезці ў Новую Зеландыю іншую вялікую партыю наркотыкаў.

Палітычныя і дзяржаўныя дзеячы Новай Зеландыі, журналісты імкнуцца прыцягнуць увагу грамадскасці да распаўсюджвання наркотыкаў у краіне. Паліцыя ўмацавала таможні кантроль, прымяняюцца спецыяльна трэніраваныя сабакі. Але цяжка не пагадзіцца з супрацоўнікам нацыянальнага таварыства па праблеме алкагалізму і наркаманіі Б. Томасам, які лічыць, што вырашыць гэта пытанне, відаць, можна толькі ў сукупнасці з іншымі сацыяльнымі і эканамічнымі праблемамі, якія стаяць перад краінай.

С. Зімін,
АДН

Пачатак на стар. 1

МЭБЛЯ З СУПРАСЛІ

— У нас рабочай сілы ніколі не занмога. Не будзе нават памылкай, калі скажам, што выступае яе недахоп і таму кожную колькасць працаўнікоў мы прымем.

А ўмовы працы добрыя. Дырэкцыя дбае пра гэта. Хутка аддадуць у карыстанне працаўнікам разам з буфетам вялікую, на 80 месц, сталовую. Ды і сама праца цікавая ды значна аблегчаная. Усё новыя машыны. Нядаўна закупілі за 700 тысяч злотых заходненямецкую аклеінярку „Райман" і за 400 тысяч злотых шасціваловую палерку. А пасля працы і адпачыць ёсць дзе. Ёсць прыгожая святліца, дзе можна паслухаць музыку, паглядзець тэлевізар, патанцаваць.

М. Шаховіч

TELEWIZJA WARSZAWA

Sobota 9.X. 6.00 Radiowo-Tel. Szk. Śred. Biolog. 6.30 Tech. Rol. Mech. rol. 8.30 Romeo i Julia — film fab. radz. 10.00 Dla szkół (kl. I—III) Czerw., żółte, ziel. 13.45 Tech. Rol. Fiz. 14.30 Up. rośl. 15.40. Redakcja Szkolna zapow. 15.50 Pr. dnia. 15.55 Dla dzieci. 16.30 Dzien. 16.40 Obiektyw. 17.00 Pr. estrad. 17.25 Sobota Mł. 18.10 100 pytań do K. Pendereckiego. 19.00 Dobr. 19.30 Wieczór z Dzien. 20.40 714 wzywa pomocy — film fab. USA. 21.55 Z naj. życz. dla kolejarzy. 23.25 Dzien. 23.45 Sport.

Niedziela 10.X. 6.00 Tech. Rol. Fiz. 6.30 Upr. rośl. 7.00 Kurs Rol. 8.00 Przyp., radz. 8.10 Now. w domu i zagr. 8.35 Sport dla wszyst. 8.50 Pr. dnia. 8.55 Sport. 9.00 TELERANEK. 10.20 Antena. 10.45 Opowieść o Rustamie — film fab. ZSRR cz. II. 12.00 Dzien. 12.20 Parada Reprezent. Orkiestr Dętych WP — Białystok 76. 13.20 Z kamerą wśród zwierz. 13.50 Dla dzieci. 14.40 Bitwa o Alezję — film dok. 15.45 Los. Duż. Lot. 16.00 Opowieść o ludzkim sercu — film fab. radz. 17.10 Sport. 18.00 Tele-Echo. 19.00 Wieczor. 19.30 Wieczór z Dzien. 20.40 Bajka dla dor. 20.50 Potyczka pod Schöngraben — film ser. ang. (Wojna i pokój). 21.40 Pr. rozr. 22.20 Sport.

Poniedziałek 11.X. 12.45 Radiowo-Tel. Szk. Śred. J. pol. 13.25 Fiz. 15.50 NURT. 16.25 Pr. dnia. 16.30 Dzien. 16.40 Obiektyw. 17.00 Dla dzieci. 17.50 Po prostu życie — film fab. ZSRR. 19.00 Dobr. 19.30 Wieczór z Dzien. 20.40 Teatr TV: J. Kasak — Decyzje. 22.15 Pr. muz. 22.45 Dzien.

Wtorek 12.X. 6.00 Radiowo-Tel. Szk. Śred. J. pol. 6.30 Fiz. 9.00 Dla najmł. (kl. I) Mat. 10.00 Wojna i pokój — film ser. ang. odc. 3. 11.05 Dla szkół (kl. III lic.) J. pol. St. Wyspiański — Wesele. 11.55 Ur. Odpr. Wart przed Grobem Niezn. Żołn. 13.45 Tech. Rol. Chem. 14.30 Mech. rol. 15.55 Pr. dnia. 16.00 Na wielk. i mał. ekr. 16.30 Dzien. 16.40 Obiektyw. 17.00 Przyp., radz. 17.05 Rodowody — JANEK KRASICKI. 17.45 Stud. Tel. Mł. 18.30 O wolną i ludową — film dok. 19.00 Dobr. 19.30 Wieczór z Dzien. 20.40 Południk Zero — film sens. pol. 22.10 Niezapomniane melodie. 22.35 Dzien.

Środa 13.X. 6.00 Tech. Rol. Chem. 6.30 Mech. rol. 7.35 Południk Zero — film fab. pol. 9.00 Dla szkół (kl. VI) Fiz. O siłach. 10.00 (kl. VII) O ruchach. 11.05 Hist. W noc listopadową. 12.45 Radiowo-Tel. Szk. Śred. Chem. 13.25 Tech. Rol. Hod. zwierz. 15.50 NURT. 16.10 Pr. dnia. 16.15 Los. Mał. Lot. 16.30 Dzien. 16.40 Obiektyw. 17.00 Przyjaciołom, wychowawcom. 17.55 P. nożna. CSRS — Szkocja. 18.45 Lekt. Pegaza. 19.00 Dobr. 19.30 Wieczór z Dzien. 20.40 Filmy Bergmana: Miasto portowe. 22.20 Śpiewa Nicoletta. 22.45 Dzien.

Czwartek 14.X. 6.00 Radiowo-Tel. Szk. Śred. Chem. 6.30 Tech. Rol. Hod. zwierz. 8.25 Filmy Bergmana: Miasto portowe. 10.00 Dla szkół (kl. II lic.) J. pol. A. Puszkin. 12.00 (kl. VIII) Wł. Reymont. 12.35 Decyzje piętnastolatków. 13.45 Radiowo-Tel. Szk. Śred. Wskaz. met. 14.30 Tech. Rol. Mat. 16.25 Pr. dnia. 16.30 Dzien. 16.40 Obiektyw. 17.00 Przyp., radz. 17.05 Ekran z bratkiem. 18.10 Patrol. 18.35 Konsylium cz. I. 19.00 Dobr. 19.30 Wieczór z Dzien. 20.40 Teatr Sensacji: F. Durbridge — Brutalna gra cz. III. 21.45 Pegaz. 22.30 Konsylium cz. II. 22.45 Dzien.

Piątek 15.X. 6.00 Radiowo-Tel. Szk. Śred. Wskazówki met. 6.35 Tech. Rol. Mat. 9.00 Dla najmł. (kl. III) Żołnierz polski. 10.00 Wszystko dobre, co dobrze się kończy — film fab. bułg. 12.00 Dla szkół (kl. VIII) Wych. ob. Org. pracy Sejmu PRL. 12.45 Radiowo Tel. Szk. Śred. Mat. 13.25 Biolog. 15.50 NURT. 16.25 Pr. dnia. 16.30 Dzien. 16.40 Obiektyw. 17.00 Dla dzieci. 18.00 Inf. Wyd. 18.20 Eureka. 19.00 Dobr. 19.30 Wieczór z Dzien. 20.40 Znaki szczególne — film pol. 21.45 Operowe qui pro quo. 22.50 Dzien.

ТЭЛЕВІЗІЯ МІНСК

Piątek 8.X — 8.30 Film fab. 9.30 Koncert. 13.55 Film fab. 17.30 Film ser. 19.30 P. nożna. Spartak — Dynamo (Moskwa). 2 połowa. 20.15 Koncert.

Sobota 9.X — 8.30 Film ser. 12.10 Film fab. 15.00 W świecie zwierz. 16.15 Ameryka. 17.10 Spektakl TV. 19.30 Koncert.

Niedziela 10.X — 9.00 Spektakl TV. 12.00 Film fab. 15.15 Cyrk. 16.15 Film anim. 16.35 Klub film. 17.35 Piosenka — 76. 18.15 Film fab. 20.30 Filmy anim. dla dor.

КІНО

Białowieża W środku lata — pol. 12—13. Trzej muszkieterowie — panam. 14—15. Syn. — fr. 16—17.

Czyże Podróż — wł. Znikąd do nikąd — pol. 16—17.

Dubicze Cerkiewne Pułapka — pol. Motyle — pol. 13—17.

Gródek W środku lata — pol. 16—17.

Michałowo Ostatni wiosenny śnieg — USA 12—13. Kronika gorącego lata — NRD 14—15. Zorro — wł. 16—17.

Mielnik Czerwone i białe — pol. 13. Dziewczyna z laską — wł. 16—17.

Milejczyce Czekam aż zabijesz — czes. 12—14. Can amore — pol. 13—17.

Narew Gdzie jest generał — węg. Deps — jug. 13—17.

Narewka Poszukiwany, poszukiwana — pol. Pięć łatwych utworów — USA 13—17.

Nurzec Zbrodnia jest zbrodnią — fr. 12—13. W każdym domu dziewczyna — czes. 14—15. Mniejszy szuka dużego — pol. 16—17.

Orla Ostatni wiosenny śnieg — wł. Przeznaczenie ma imię Kamila — czes. 13—17.

Rajsk Szerokiej drogi kochanie — pol. Przygoda na wagarach — NRD 13—17.

B.Z.Graf. Zam. 2318 F-4.

Славянскае золата

Адкрытая 16 верасня гэтага года ў акруговым музеі ў Беластоку выстаўка **„Бурштын — выкапневая смала“** з'яўляецца значнай падзеяй у музейнай справе нашага рэгіёна. А гэта таму, што, па-першае, ніколі ў Беластоку не дэманстравалася выстаўка, спецыяльна прысвечаная гэтаму надта цікаваму выкапню, па-другое, на выстаўцы паказана каля 500 экспанатаў, якія прадстаўляюць самыя разнастайныя постаці і формы гэтага мінералу, выбраныя сярод амаль 20 тысяч яго экземпляраў, што захоўваюцца ў фондах варшаўскага Музея Зямлі Польскай акадэміі навук. Пры тым варта прыгадаць цікаўнасць: самы вялікі кавалак бурштыну ў Музеі Зямлі важыць 2,05 кілаграма, а самы вялікі на Зямлі бурштын важыць звыш 9 кг і знаходзіцца ў зборах Берлінскага універсітэта імя А. Гумбальта і быў знойдзены на тэрыторыі Быдгашскага ваяводства ў Польшчы.

Дзякуючы вялікаму ўкладу працы д-р Касмоўскай-Цэрановіч — навуковага працаўніка Музея Зямлі, адначасова камісара і аўтара сцэнарыя выстаўкі — бурштын або інакш „славянскае золата“ заззяў на выставачных стэндах усёй сваёй красою, у чым немалая заслуга таксама мастакоў — афарміцеляў выстаўкі: З. і Т. Кабылкаў, Р. Куліцкай і П. Межаеўскага.

Заахвочваючы ўсіх, асабліва ж школьную моладзь, наведаць гэтую надта каштоўную для пазнання таямніц і багаццяў нашай зямлі выстаўку, не магу ўстрымацца, каб з яе нагоды не паразважаць аб бурштыне з басейна нашай ракі Нарвы і яго ролі ў гісторыі гэтай зямлі.

Вядома, самымі багатымі бурштынам землямі ў Еўропе з'яўляюцца ўзбярэжжа Балтыйскага мора, асабліва паўастравы — Самбія і Ютландыя, і вялікія прасторы аж да Уральскіх гораў. Побач з гэтымі месцазнаходжаннямі бурштыну, значная яго колькасць спрадвечна была вядома ў сярэднім цячэнні ракі Нарвы, асабліва на яе правым беразе, а таксама ў басейнах рэчак, што ўпадаюць у яе з правага боку. Нараўскі бурштын быў здаўна вядомы людзям. Яго здабывалі не толькі мясцовыя жыхары, ён трапляў таксама ў рукі купцоў, а за іх пасрэдніцтвам вандраваў у далёкую Грэцыю і Рым, дзе з яго выраблялі дарагія, па цане роўныя золату, упрыгожанні, амулеты, прынасячыя шчасце, духмянае кадзідла, лякарствы. Варта прыгадаць, што ў I стагоддзі нашай эры ў Рыме маленькая фігурка, вырэзбленая з бурштыну, каштавала больш, чым нявольнік. Таму грэчаскія і рымскія землепраходцы і купцы, перамагаючы боязь, падаваліся ў „варварскія“ землі ў басейн Віслы, Нёмана і Дняпра, каб шляхам абмену з тамашнімі жыхарамі здабываць каштоўнае „золата поўначы“ — бурштын. Праўдападобна, самбійскі і нараўскі бурштын пачаў вандраваць у старажытную Грэцыю яшчэ ў V стагоддзі да нашай эры. Іменна дзякуючы гэтаму ў славутую „Гісторыю“ Герадота трапляе даволі абшырнае апісанне племені неўраў, якія паводле меркаванняў вучоных нашых часоў, насялялі землі паміж рэкамі Нурцом і Нарвай і разам з суседнім з імі племем будзінаў склалі праславянскае насельніцтва. Прыцягальная сіла нараўскага бурштыну была прычынай і таго, што ўздоўж ракі Нарвы, ад яе сярэдняга цячэння ўверх, г.зн. праз цяперашнюю Белавежскую пушчу, пралягаў адзін з рухлівых бурштыновых шляхоў, які вёў да чарнаморскага ўзбярэжжа. Наколькі гэты шлях быў вядомы і пратораны, сведчыць факт, што па ім з пабярэжжа Балтыйскага мора на бераг Чорнага мора павандравалі ў I-II стагоддзях нашай эры ваяўнічыя готы. Пстым па гэтым жа шляху-гасцінцы ішлі іншыя вандраўнікі, пакідаючы тут рымскія манеты, а нават посуд, які між іншым быў знойдзены ў „княжацкіх“ курганах у Растолтах.



Фрагмент выстаўкі „Бурштын — выкапневая смала“. Стэнд з ювелірнымі вырабамі з бурштыну, а таксама народныя прылады з пабярэжжа ракі Нарвы, якімі яго тачылі і шліфавалі.

Цанілі бурштын не толькі старажытныя грэкі і рымляне. Аздобы з яго ахвотна насілі таксама і мясцовыя прыгажуні. У сярэднявеччы папулярнасць бурштынавых вырабаў сярод арыстакратыі крыху зменшылася на карысць золата, серабра і шляхетных каменняў. Аднак нязменна цаніў яго мастацкую каштоўнасць просты народ, асабліва сяляне з пабярэжжа ракі Нарвы.

У наш час вартасць бурштыну як матэрыялу для ювелірных вырабаў узрастае з кожным годам. Ён знаходзіць таксама прымяненне ў нарыхтоўцы асабліва каштоўных фарбаў і лакаў і нават пры пабудове міжпланетных караблёў-ракетаў.

Выстаўка будзе адкрыта да 15 лістапада бягучага года.

Ігнат Снарскі
Фота аўтара

НА СТРАЖЫ ЛАДУ І СПАКОЮ

Людзі ў цёмна-блакітных мундзірах, наша Грамадзянская міліцыя...

Так ужо ёсць у жыцці: аб іх мы памятаем часцей, калі трапляем у бяду, і радзей звяртаемся да іх у радасці і шчасці. Але яны заўсёды і ўсюды прысутнічаюць у нашай свядомасці як тая збаўчая моц справядлівасці, што заўсёды знаходзіцца на стражы твайго і майго спакойнага жыцця, непарушнасці нашай агульнай і прыватнай маёмасці, грамадскага ладу і парадку ва ўсёй краіне. І ці толькі гэта?

Малодшы харунжы **Уладзіслаў Аўштэль** служыць у органах міліцыі звыш васьмі год, у тым ліку шэсць год з'яўляецца камендантам пастарунка МО ў Васількове. Праца не належыць да спакойных, вядома: гміна вялікая, улетку вельмі рухлівая, бо месца адпачынку беластаччан, узімку таксама не сонная, бо прыгарадная. Штодзень перавальваюцца па гэтым абшары тысячы чалавек на работу ў Беласток і дамоў назад, а рух людзей заўсёды спрыяе розным парушэнням ладу і парадку, стварае больш спрыяльныя ўмовы для злачынства. І ўсё ж васількоўская гміна належыць да самых спакойных на тэрыторыі ўсяго нашага ваяводства, а гэта знак таго, што камендант У. Аўштэль і яго падуладныя старанна выконваюць свае абавязкі.

Тыя нямногія вольныя ад адказных службовых абавязкаў хвіліны, што астаюцца яму для так званага прыватнага жыцця, У. Аўштэль без рэшты прысвячае актыўнай грамадскай дзейнасці. А дзейнасць гэтая ў яго шматпланавая. Ён — член Экзекутывы гарадскога і гміннага камітэта ПАРП, старшыня камітэта Фронту адзінства народу, радны гарадской і гміннай рады нарадовай і старшыня клуба радных ад ПАРП, член гарадскога і гміннага праўлення Саюза сацыялістычнай польскай моладзі і член Ваяводскага праўлення ССПМ у Беластоку. І за кожным з гэтых абавязкаў — вялікі ўклад працы. Для У. Аўштэля стала жыццёвай неабходнасцю быць увесь час у гушчы жыцця, удзельнічаць у ім з поўным заангажаваннем, дапамагаць у вырашэнні ўсіх важных і часам надта складаных спраў свайго асяроддзя. І ў гэтым, бадай, адна з прадпасылак той вялікай пашаны, з якой адносяцца да яго людзі.

Складаючы малодшаму харунжаму Уладзіславу Аўштэлю сардэчныя віншаванні з нагоды свята працаўнікоў Грамадзянскай міліцыі і Публічнай бяспекі, выказваем вялікую ўдзячнасць усім высакародным людзям у цёмна-блакітных мундзірах.

І. Снарскі

АД РОДНЫХ НІЎ

Юшкаў Груд

Едзеш ў той бок на Ялоўку —
ўзгорак, вёска Юшкаў Груд.
Прылягла з бакоў смалоўка,
чаго трэба знойдзеш тут.

Глянеш ўправа — кулка, кузня,
кавалі ў кавадла б'юць.
А налева — хлопцы дружна
пры спулдзельні піва п'юць.

Дзе найвышэй — агароджа,
цэркаўка у ёй стаіць
і навокал так прыгожа
грудок цэлы весяліць.

І раміза ёсць у вёсцы,
як аб ёй мне не сказаць;
пажарнікі добры хлопцы,
гонар трэба ім аддаць.

На млячарню наракаюць
(яно так ужо здаўна),
зато школу паважаюць —
справядлівая яна.

Дзе купляць усё — спулдзельня,
з ёю жыць нам не бяда.
Пошта — гутарка аддзельна,
бо працуе на медаль.

У ёй газета без гавору,
і пісьмо не прападзе,
яно заўша ў час, у пору
табе ў рукі пападзе.

І дантыстка у нас добра,
больш такой нідзе не ўзяць.
А ці будзе яна доўга?
Кажуць, хоча уцякаць.

Ужо спулдзельня для здароўя
мусіць хворая сама,
Дахтароў па двое мела,
цяпер жаднага няма.

Хварэць заўша тут не можна,
бы калі, бы ў які час,
толькі серада й субота
вызначаюцца для нас.

А. Леўшук,
Цiванюкі

МІНІ-ІНТЭРВ'Ю СА ЗДЫМКАМ

У пчаляра і паляўнічага

Гэтую размову мне давялося правесці ў пасецы, дзе мой размоўца — **Мікалай Казімерук** з вёскі Сухавольцы гм. Кляшчэлі, — разварушыўшы раёў шэсць ці сем, браўся якраз за догляд чарговага вулля. А я... у звычайнай кашуліне ды з адкрытым тварам. Вакол кружылася плойма разазлаваных пчолаў, і ад іхняга гнеўнага зыку ў мяне не то, што ногі ад страху ўгіналіся, але лекацела і аблівалася халодным потам усё цела. Ды чаго не зробіць журналіст для свайго чытача і свае любімай газеты?!

— Вы — малады, нежанаты чалавек, адкуль жа ў вас улюбёнасць да пчалярства?

— Крыху па бацьку, ён займаўся пчалярствам, — адказвае М. Казімерук, — але найбольш з уласнага зацікаўлення гэтым надта прыемным і карысным заняткам. Калі глядзіш на працавітасць пчолаў, іх старанлівасць і клопаты пра агульнае дабро, дык і самому хочацца працаваць яшчэ больш актыўна. Затым — цішыня, спакой, ніякіх нерваў. Для належнага вядзення пасекі даводзіцца многа чытаць спецыяльнай літаратуры па пчалаводству, а таксама папрацаваць у сваёй жа сталярні над падрыхтоўкай вулляў, бо так і танней і лепш. Пчалярствам займаюся ўжо пяць год, і скажу вам — гэта чыстая прыемнасць і задавальненне.

— Вы працуеце толькі на гаспадарцы?

— Не, гаспадарка і пчалярства — гэта мой дадатковы занятак. Я — абсальвент эканамічнага ліцэя ў Беластоку і працую па сваёй спецыяльнасці ў СКР-ы ў Кляшчэлях.

— Ці пчалярства — гэта ваша адзінае хобі?

— Яшчэ люблю паляўніцтва, і найбольшым маім здабыткам дагэтуль з'яўляецца 100-кілаграмны дзік, якога я застрэліў ва ўрочышчы Пухава.

— А што ў пчалярстве?

— Цяпер мая пасека складаецца з 70 вулляў, у тым ліку з селекцыйных 15 краінскіх раёў, 15 — каўказскіх і 40 краёвых. Апошнія два гады наогул былі даволі шчодрыя для пчолаў, у апошнім годзе асабліва месяц ліпень даў добры збор. Зразумела, маю на ўвазе тыя пасекі, гаспадары якіх паклапаціліся пра адпаведную падрыхтоўку сямей да ўзяткаў. Сёлета ў мяне кожная сям'я дала ў сярэднім па 30 кілаграмаў мёду. Няцяжка палічыць, колькі даходу прынесла пасека, калі за адзін кілаграм мёду „Вітаміна“ плоціць па 60 злотых.

Размаўляў і фатаграфаваў
І. Снарскі

Беларускія кнігі

У кнігарні імпартных выданняў у Беластоку, вул. Кілінскага 10, можна набыць наступныя кнігі на беларускай мове:

Багдановіч Максім, Мушка-зелянушка і камарык — насаты тварык, 1975, цана 1 зл. 50 гр.

Займальная вершаваная казка пяра вядомага нашага лірыка. У гэтым творы таленавіта выкарыстаны матыў беларускай жартоўнай народнай песні пра камара, што закахаўся ў муху.

Якімовіч Алесь, Залатыя рукі, 1975, стар. 160, цана 3 зл. 60 гр.

Зборнік выбраных апавяданняў для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту, самых цікавых і самых вядомых сярод багатай творчасці гэтага сучаснага беларускага пісьменніка.

Камейша Казімір, Гаёўка, 1975, цана 1 зл. 70 гр.

Выбраныя вершы для дзяцей маладога беларускага паэта. Зборнік аздоблен каляровымі малюнкамі А. Дэмарына.

Разумная дачка, 1975, цана 1 зл. 30 гр.

Вядомая беларуская народная казка ў апрацоўцы А. Якімовіча з каляровымі ілюстрацыямі Ул. Савіча.

Дзеружынскі Авяр'ян, Каласок, 1975, стар. 48, цана 3 зл. 90 гр.

Выбраныя вершы і вершаваныя казкі, між іншым: „Перапёлка“, „Барсук і ліса“, „Баявы конік“, „Варона і рак“ і інш. Каляровыя малюнкі Я. Жыліна.

Кнігарня ахвотна высылае кнігі за паштовым залічэннем. Запатрабаванні кіруйце па адрасу: „Dom Książki”, 15-089. Białystok, ul. Kilińskiego 10.

(мг)

У гміне Гарадок

ПАСЛЯ ШКОЛЬНЫХ РАМОНТАЎ

У адрамантаваных і свежа памаляваных класах пачалі новы навучальны год вучні ў школе ў Меляшках. Свежай фарбай пахнуць яшчэ сцены ў прасторных залах і калідорчыках у гарадоцкім прадшколлі. Малявалі сцены таксама ў жылых кватэрах настаўніцкіх сем'яў у Гарадку і ў вёсцы Барок. Усе гэтыя класы, залы і памяшканні адноўлены коштам каля 250 тысяч злотых з гміннага фонду. (ця)

Ці ведаеце, што...

...на Беласточчыне ў 1975 годзе ў 150 школьных кааператывах было 10 208 членаў.

...у конкурсе „Вучымся гаспадарнасці“ ў групе пачатковых школ першае месца занялі школьнікі з Сухаволі, другое — з Кляшчэляў, трэцяе — з Семіхочаў. гм. Мілейчыцы; у групе сярэдніх школ першае месца занялі навучэнцы сельскагаспадарчага тэхнікума ў Рудцы, другое — школы механізацыі сельскай гаспадаркі ў Міхалове, трэцяе — сельскагаспадарчага тэхнікума ў Астражанах.

...ГС-ы арганізавалі самастойна 37 дзяцінцаў і 118 дзяцінцаў супольна з іншымі арганізацыямі, у іх разам удзельнічала 3 923 дзяцей, а ў 23 пунктах апекі над дашкольнікамі было 524 дзяцей. (мг)

Падчас юбілейнай урачыстасці — 50-годдзя каманды пажарнікі атрымалі сцяг і залаты медаль „Заслужаны для пажарніцтва“. Памятны здымак пажарнай каманды.

Кляшчэлеўскія пажарнікі

Васіль Артысевіч — адзін з арганізатараў пажарнай каманды ў 1925 годзе. Ён, калі ішоў фронт ў 1944 годзе і гарэла раміза, выратаваў шмат абсталявання пажарнікаў.

Добраахвотная пажарная каманда (ОСП) у Кляшчэлях з'яўляецца адной з найстарэйшых у Беластоцкім ваяводстве. Арганізавалася яна ў 1925 годзе пасля вялікага пажару ў Кляшчэлях. Тады перадавыя жыхары мястэчка вырашылі стварыць арганізацыю, якая на выпадак такога няшчасця магла б ратаваць людскую маёмасць. Да сёння жыве ў Кляшчэлях і яшчэ даволі добра сябе адчувае Васіль Артысевіч, які быў адным з арганізатараў пажарнай каманды ў 1925 годзе. Ён найбольш можа расказаць, як здабывалі аўтарытэт мясцовыя пажарнікі ў тыя далёкія гады.

— Перш за ўсё, — гаворыць Васіль Артысевіч, — дружнасць, дысцыплінаванасць, умеласць барацьбы са стыхіяй агню далі добрую ацэнку нашай камандзе. Такія рысы выдзяляюць яе і сёння сярод многіх каманд у раёне. Гэткую апінію падтрымлівае і раённы камендант ОСП Яўген Пятровіч з Гайнаўкі.

Менавіта таму падчас спозненага на год святкавання іх юбілейнай даты — 50-годдзя (юбілейная ўрачыстасць адбылася 5 ліпеня 1976 года) Цэнтральны саюз добраахвотных пажарных каманд даручыў ваяводскім прадстаўнікам гэтага саюза ўручыць прызнаную кляшчэлеўскай камандзе сваю самую высокую ўзнагароду — залатую адзнаку „Заслужаны для пажарніцтва“. Гэтую адзнаку атрымалі таксама некаторыя яе члены. На сваім рахунку кляшчэлеўская пажарная каманда мае шмат выездаў у далёкія мясцовасці, шмат удзячнасці ад людзей, якім выратавалі яны ад агню каштоўную маёмасць. На сваім рахунку маюць таксама шмат грамадскай працы. Яны грамадскім чынам будавалі сваю рамізу, а таксама актыўна ўключаліся ў многія грамадскія чыны.

І так, ужо 51 год ахвярна служаць яны людзям. За гэты час састарыліся многія члены пажарнай каманды, некаторых няма ўжо ў жывых, некаторыя выехалі з Кляшчэляў. На змену ім прыйшлі маладыя людзі, якія працягваюць іх традыцыі. Прыйшла таксама новая тэхніка. Ужо конны пажарны воз і ручная помпа належаць да гісторыі. Сённяшнія пажарнікі Кляшчэляў запісваюць у сваю хроніку новыя дасягненні добрай і патрэбнай людзям дзейнасці.

Тэкст і фота **М. Хмялеўскага**



Раённы камендант Саюза добраахвотных пажарных каманд — Яўген Пятровіч і начальнік гміны ў Кляшчэлях — Андрэй Місеюк. Яны аказваюць вялікую дапамогу пажарнай камандзе і адстойваюць хвалюючыя іх справы. Пажарнікі высока ацэньваюць іх дапамогу.

З маёй званіцы

КАЛОДЗЕЖ

Ці ведаеце вы, дзе знаходзіцца вёска Задрыпанка? Не ведаеце? То я вам падкажу. Яна знаходзіцца ў гміне Бабікі, а ад 15 ліпеня задрыпала ў гміну Шудзялава. Тут я хачу вам, даражэнькія, расказаць аб двух гаспадарах, якія жывуць у той Задрыпанцы. Іх бацькі пабудавалі супольны калодзеж. Ну што ж, калодзеж гэта не карова, вады хопіць (вы скажаце). І праўда, хапала. Але нічога вечнага няма, у калодзежы цэмбравіны пакрышыліся, парабіліся дзіркі. Як пояць жывёлу, тая робіць гразь ды ў гразь паскудзіць. І тое ўсё цераз дзіркі плыве ў калодзеж. Вада падобна на піва ды яе штораз меней, бо граззю заплывае. Яны да такой вады прызвычаіліся, ім яна добрая. Але стала не хапаць вады і яны пачалі раней вылазіць з ложка, каб набраць вады. Рамонтаў не рабілі, а адзін на другога спадзяваўся, аж пачалі грызціся, як сабакі. А людзі толькі з гэтага смяяліся, аж жываты пухлі. А жанкі іх кожну раніцу гарланілі на ўсю Задрыпанку. Так адна другую давяла да злосці, што ў калодзеж накідалі каровінага калу. Перасталі з свайго калодзежа карыстацца, пайшлі па ваду да суседзяў. Але хадзілі туды не доўга. Адна патаптала суседу гарод ды каля калодзежа набрудзіла, сусед забараніў хадзіць па ваду. Другая набрахала на суседа, і той загарадзіў пераход. Так што абедзве не мелі адкуль браць ваду.

Пытанне: Як вам здаецца, будуць суседзі рамантаваць супольны калодзеж?

Адказ: Кожны пабудаваў сабе новы калодзеж. А стары астаўся, як быў.

Янкі

СКР У НАРАЎЦЫ

Кааператыў сельскагаспадарчых гурткоў (СКР) у Нараўцы з сядзібай у Міклашэве, пачаў даваць сельскагаспадарчую прадукцыю. У мінулым годзе ўпершыню пасеяў 60 гектараў азімага жыта. Увогуле вядзе ён гаспадарку на 103 гектарах зямельных угоддзяў. Другой галіной яго дзейнасці з'яўляецца загаспадарванне пасбішчаў і сенажацяў непадалёку ад вёсак Лука і Слабодка. СКР пасеяў на іх значную колькасць мінеральных угнаенняў. Цяпер на 158 гектарах расце высокая і густая трава. Пасуцца тут каровы жыхароў Лукі, Слабодкі, Церамкоў і іншых бліжэйшых вёсак. (ця)

Кажуць, што...

СКР у Бабіках набыў у гаспадара 1 гектар зямлі, пабудаваў там дом на кантору, усё абгарадзіў сеткаю, асвятліў, зрабіў браму. Цераз гэту браму трэба праходзіць кожнаму, хто хоча зрабіць заказ на выкананне палявых работ трактарам. І тут бяда, бо ў браме паставілі дошку, на якой напісана: чужым уваход забаронены.

Навошта яна стаіць, як кожнаму трэба ўваходзіць?

Ніяк

Беларуская літаратура
Аляксандар Баршчэўскі

НАШАНІЎСКАЯ ПАРА

АЛЬБЕРТ ПАЎЛОВІЧ — ЧАСТКА XV

Гумарыстычная плынь. Сацыяльныя адносіны. У гэтым раздзеле разглянем тыя вершы, у якіх пісьменнік паказвае ў камічным асвятленні адносіны паміж сялянамі і панамі, сялянамі і інтэлігенцыяй, урэшце паміж панамі. Да вершаў, у якіх выступаюць гэтыя праблемы, залічаем: „Пан і акуляры“, „Ракі“, „Далікатнасць за далікатнасць“, „Сак піў“, „Шчодрая ахвяра“, „У фельчара“, „Рэцэпт“, „Кравец Юдэль“, „Нэйтралітэт“, „Няўмекі і лекі“.

Спачатку разгледзім вершы, якія ілюструюць розныя камічныя здарэнні паміж панамі і сялянамі. Да гэтых вершаў належаць: „Пан і акуляры“, „Ракі“, „Кравец Юдэль“.

У вершы „Пан і акуляры“ Паўловіч рысуе грамаду сялян, якая прыйшла да пана, каб атрымаць заплату за выкананую працу. Селяніну Рыгору пан выплаціў менш, чым яму належалася. Калі Рыгор пачаў пратэставаць, пан надзеў на нос акуляры і пачаў правяраць у сшытку. Аказалася, што селянін праў. Пан даў Рыгору ўласцівую суму, перапрасіў яго і пачаставаў кілішкам гарэлкі. Увесь камізм праяўляецца ў апошніх радках верша. Расчулены селянін карыснае вырашэнне канфлікту звязвае са „шклянымі вочкамі“, гэта значыць панскімі акулярамі, і адсюль яго варожасць да натуральных панскіх вачэй, якія не дагледзелі поўнай належнай селяніну сумы грошай.

Камізм выказвання селяніна абсалютна не прадуманы і непрадузяты. Ён стыхійны і шчыры:

— Во дай жа, божа, мой паночку,
Здароўя гэтым шкляным вочкам:
Лепш панскіх свецяць, каб не згласіць,
А тыя хай хоць павылазяць.

У вершы „Ракі“ маем дачыненне з іншай, чым у творы „Пан і акуляры“ камічнай сітуацыяй. Адзін пан вырашыў паслаць селянінам Якавам торбу ракаў свайму суседу-пану. Разам з ракамі ўручыў селяніну ліст, у якім паведамляў суседу аб сваім падарунку. Змучаны доўгай ношай, селянін прылёг у лесе адпачыць. У часе яго сну ўсе ракі распаўзліся па лесе. Якаў зайшоў да пана з пустой торбай. Пан прачытаў ліст і будучы перакананым у тым, што ракі ўжо на кухні, даў селяніну манету і прасіў падзякаваць за падарунак, падкрэсліваючы, што з ахвотай паесць ракаў.

Селянін-разява быў вельмі здзіўлены паваротам сітуацыі. Чакаў кары, а атрымаў узнагароду. Варта прывесці дзве апошнія страфы верша, у якіх кульмінацыя супадае з заканчэннем:

— Ты ж падзякуй свайму пану ад мяне сардэчна
За гасцінец і за памяць. Не забудзь канечна
Праз іх ласку, скажы пану. Заўтра з'ем прысмакаў.
Як быў смутны, дык так раптам звесялеў наш Якаў:
— Панок мілы! Ці ж то ракі ўжо прыйшлі да пана?
Дзякуй богу! Яны ў лесе распаўзліся зрана.
Я ўжо думаў яны зблудзяць, каб іх безгалоўе.
Аж, бач, не. Дык, мой паночак, ешце на здароўе!

Верш даволі вымоўны, калі гаварыць аб ідэйнай накіраванасці. Хаця і няма ў ім якіх-колечы адаўтарскіх тэндэнцый, то ўсё ж такі няма сумненняў у тым, што селянін выходзіць тут на прыдурка. Такім чынам, у творы праяўляецца схільнасць, аб якой мы ўжо гаварылі пры некаторых гумарыстычных апавяданнях Ядвігіна Ш. Па сутнасці няма сумненняў у тым, што верш „Ракі“ — гэта фабулярна-вершаваная апрацоўка „панскага“ анекдота аб прымітыўненькім мужыку, які паверыў, што ракі ўслед за ім самі прыйшлі да пана.

Апошні верш „Кравец Юдэль“ толькі ўмоўна можна аднесці да цыкла твораў, ілюструючых адносіны паміж панамі і сялянамі. Справа ў тым, што галоўны герой твора Юдэль з'яўляецца не селянінам, а рамеснікам. Аднак у сувязі з тым, што належыць ён да катэгорыі людзей працы, умоўна залічаем гэты твор да вышэй названага цыкла. Змест вершаванага апавядання просты. Пан бярэ да сябе ў маёнтак з мястэчка краўца з мэтай, каб пашыў ён адзенне з дарагога матэрыялу. Кравец усё жыццё шыў для беднаты сярмягі і таму не ведае, як пашыць вопратку на панскае плячо.

Ноччу нечакана для самога сябе, пана і па сутнасці таксама чытача Юдэль крадзе матэрыял і ўцякае з маёнтка.

Новае тут заключаецца ў тым, што не бядак, а багаты становіцца ахвярай здарэння. Істота аднак заключаецца ў тым, што чытач не можа тут салідарызавацца з бедаком-пераможцам, які атрымаў перавагу шляхам звычайнага зладзейства.

Шудзялаўскія праблемы

Гмінныя ўлады нясуць вялікую адказнасць за развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці, за належнае выкарыстанне ўсіх зямельных угоддзяў.

У Шудзялаўскай гміне (у склад яе ўвайшлі ад нядаўна амаль усе вёскі былой гміны Бабікі) гмінныя ўлады на чале са сваім начальнікам Рыгорам Чарневічам прыкладаюць шмат намаганняў, каб зямля не пуставала, каб кожны гектар яе быў абсеяны і даваў як найбольш зямельных пладоў. І гэтыя намаганні даюць добрыя вынікі.

У Шудзялаўскай гміне, як мала ў якой у Беластоцкім ваяводстве, вельмі многа гаспадароў здае зямлю дзяржаве ў замен за пенсію. Кожны год, так сказаць, выпадае, 12-14% гаспадарак. Ёсць такія вёскі, як Новы Востраў, Сухінічы, Кнышэвічы, дзе большая частка гаспадароў — ужо пенсіянеры. Іх землі перададзены крынскаму ПГР-у, гміннай спулдзельні сельскагаспадарчых гурткоў, альбо аддадзены ў арэнду гаспадарам.

Але нягледзячы на гэта, што значна зменшылася колькасць вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі, аднак не зменшылася ў гміне жывёлагадоўля, не зменшылася таксама дастаўка дзяржаве збожжа і мяса, а малака нават павялічылася амаль на 40%.

Спулдзельня, праўда, сутыкаецца з вялікімі цяжкасцямі пры апрацоўцы невялікіх, некалькігектаровых гаспадарак, раскінутых па многіх вёсках, пераплеценых індывідуальнымі гаспадарскімі землямі. Цяпер такіх кавалкаў зямлі налічваецца ў спулдзельні больш як 150, і цяжка яе апрацоўваць сучаснай сельскагаспадарчай тэхнікай. Ды пераезды паглынаюць шмат часу, які падчас сезонных работ вельмі дарагі. Паявілася новая праблема. Неабходная новая камасацыя — замена зямлі. Неабходна „сцаліць" зямлю СКР-у ў кожнай вёсцы, але перш за ўсё ў Сухінічах, Кнышэвічах, Паўночным Востраве, Вярхлессі, Астроўку, Піражках і Сукавічах.

Гмінная спулдзельня сельскагаспадарчых гурткоў займаецца ўжо некалькі год адкормам свіней і прадае іх дзяржаве па 1200 штук у год. Спулдзельня добра гаспадарыць. За мінулы год атрымала 3 млн. 200 тыс. даходу. Бягучы год таксама шматабяцаючы.

Праз нейкі час СКР будзе вялікай базай свінагадоўлі. Ужо ёсць дакументацыя, і будзе будавацца ў Слойцы велізарная свінаферма на 6 тыс. штук. Будзе гэта закрыты цыкл ад апаросу свінаматак да поўнага адкорму.

Цяпер гмінныя ўлады Шудзялава, а найбольш сельскагаспадарчая служба, займаюцца справамі сяўбы азімага збожжа, падрыхтоўкай кармоў на зіму і бульбакапаннем. А апрача таго — бягучымі справамі гміны і найбольш здачай гаспадарамі зямлі за пенсію. Справа ў тым, што многія здольныя да сельскагаспадарчай прадукцыі гаспадары намагаюцца набыць дакументы інвалідства і здаць зямлю дзяржаве, атрымоўваць пенсію, апрацоўваць зямлю на прыдзеленых прыўсадзебных участках і зарабляць грошы ў гэтым жа СКР-ы. Адным словам, добрыя ўмовы жыцця на вёсцы, створаныя дзяржавай, хочацца некаторым выкарыстоўваць несумленна. І за гэтым таксама сочаць гмінныя ўлады.

М. Хмялеўскі

Ф·А·Л

ХРЫС

Allegro

Штоб я бы-ла

по-гу-ля-ла:

Го-ло-вэнь-ка

Штоб я была тое знала,
была б рочок погуляла:
Гопкі, гопкі, голя, голя!
Головэнька біедна моя!
Гопкі, гопкі, голя, голя!
Головэнька біедна моя!

Ад Марыі Семянюк, 1905 г.
цы, запісаў 25 лістапада 1975 г
магнетафоннай стужкі Людмі

ШЛЯХАМ НАРОДНЫХ АБРАДАЎ

Старынскі каравай

Старына — гэта невялікая вёсачка былога Гайнаўскага павету. Ляжыць яна сярод прыгожага, дрымучага лесу. Праз Старыну цячэ рэчка Палічна, якая аддзяляе Старыну Старую ад Старыны Новай. Калі паехаць у тую вёску, здаецца, не трэба лепшага месца шукаць. Там проста хочацца жыць.

Летам у Старыну прыязджаюць у лагер дзеці з цэлай краіны, а нават Старыной не ганьбуюць і дзеці з Гродна, якія не вельмі даўно былі таксама ў гэтым жа лагеры.

Найбольш цікавае тое, што старынцы затрымалі вельмі цікавую традыцыю. У цяперашнім часе гэта вельмі рэдкае здарэнне. Гэта „каравай". Проста можна сказаць „старынскі каравай".

І вось гэты каравай распачынаецца так: перад вяселлем у суботу малады ці маладая (залежыць, у каго вяселле) запрашаюць усіх жанчын з цэлай вёскі на каравай. Не бывае такіх, якія б адмовіліся ад гэтай прыемнасці. На каравай прыходзяць пераважна жанчыны, якія жывуць са сваімі мужамі, тыя, што не маюць мужоў, не бяруць удзелу. Пры падрыхтоўцы цеста спяваюць розныя песні, звязаныя з караваем. Калі цеста гатовае, прыбіраюць яго. Робяць розных пеўнікаў, гусачак, кветачак, усё зробленае рукамі жанчын. Пасля гэтага ставяць каравай у печ і спяваюць:

„Піечка рэгочэ,
коровая хочэ,
окна мільгают,
лавы дрыгают".

А стол, на якім ўсё рабілі, мыюць, ваду выносяць і выліваюць на кветкі. Калі стол чысты, выносяць яго. Гэтага ўсяго пільнуюць мужчыны, заданнем якіх — схаваць той стол. Яны ціха пахаваюцца і чакаюць, каб знайсці добры момант і схаваць стол. Калі ўдаецца ім схаваць гэты стол, тады жанчынам ёсць яшчэ новая работа — знайсці стол. Шукаюць да таго часу, пакуль не знойдуць, а калі ўжо знойдуць стол, значыць гэта, што маладая пара будзе вельмі добра і багата жыць. Нясуць яго з песнямі і на гэтым стале гасцюююць. Жартаў у гэты момант не бракуе. Калі каравай гатовы, вымаюць яго з печы, старшы сват танцуе з караваем, а каравайніцы спяваюць песні і нясуць яго ў камору.

Пасля поўначы ўсе разыходзяцца дамоў. На другі дзень, а гэта ўжо нядзеля, вяселле адбываецца ў маладой. Перад шлюбам спяваюць песню:

„Колесо слонэчко ў гору іедэ,
молода Маруся до шлюбу іедэ".

Пасля ўсёй цырымоніі, адбываецца „пэрэпіванне", калі складаюць падарункі маладой пары. Рана-ранютка бяруць маладую і вязуць да маладога. Калі пад'едуць на панадворак маладога, спяваюць песню:

„Выйді, маті, побач,
што твой сын прывёз,
ці ялошку, ці тэля,
ці нэвіестку крутэля".

Тады бацькі чакаюць на парозе з хлебам і соллю, вітаюць маладых. Пры... каб было добрае і салодкае жыццё ў гэтай хаце. Сядаюць за стол і спяваюць:

„З-за ліеса вышла хмара,
за столом сідэла пара,
обое молодэнькі, обое хорошэнькі,
обое любіліся,
обое побраліся".

Пасля абеду прыязджаюць госці маладой, і адбываецца другі дзень вяселля. На прывітанне гасцей маладой робяць розныя фокусы, а менавіта пераапранаюцца за маладую пару, робяць свой аркестр і іншыя. Пасля абеда зноў „пэрэпіванне", але ўжо маладога, і адначасова дзяленне каравая.

Першыя асобы, якія прабуюць каравай, гэта маладая пара. Калі каравай добры, тады дзеляць ім усіх гасцей з вяселля.

А вяселле памалу зближаецца да канца. Госці раз'язджаюцца па хатах і ўспамінаюць свае ўданыя гульні — багаты „старынскі каравай".

В. Леўчук

Пра культуру ў пушчанскім сяле

Клуб прэсы і кніжкі ў пушчанскім сяле Скупава ў гміне Нараўка самы актыўны ў вядзенні культурнай дзейнасці на Гайнаўшчыне. Задбаны, прыемны, утульны. Мае арыгінальнае ўпрыгожанне пушчанскімі элементамі: губамі, што растуць на дрэвах, цікавымі карэннямі, сухімі галінкамі, звяркамі, зробленымі з шышак, каштанаў, жалудоў і моху. Клуб займае тры пакойчыкі. Вядзе яго маладая кіраўнічка Дануся Кісялеўская (на здымку з прыгожым саламяным вятраком, які робіць адзін аднасяльчанін). Арганізуе яна сустрэчы з цікавымі людзьмі, выстаўкі народнай вышыўкі і сурвэтак, колішніх блузак і саяноў, вырабаў з саломы і г.д. Амаль ва ўсе панядзелкі пасля агляду па тэлевізару новай п'есы адбываецца дыскусія аб сцэнічным мастацтве. Самадзейнасць мае тут багатыя традыцыі. Першую тэатральную пастаноўку тутэйшая моладзь рыхтавала ў 1961 годзе. Былі гэта „Прымакі" Я. Купалы. Пасля дзяўчаты і юнакі ставілі новыя п'есы: „Мікітаў лапаць", „Пярэстая красуля", „Паўлінка", „Міхалка". Артысты-аматары займалі добрыя месцы, а ў 1975 годзе ставілі п'есу „Мікітаў лапаць", і журы прызнала ім першае месца на цэнтральным аглядзе драмгурткоў. Такім чынам прыдбалі яны шматлікія рэчавыя і дыпломныя ўзнагароды. З пастаноўкамі самадзейнікі са Скупава выступалі ў ваколіцы, а нават у Чыжах, Ласінцы, Трасцянцы.

Жанчыны са Скупава сёлета ўдзельнічалі ў конкурсе „Беларуская песня-76". Выступалі з фальклорнымі песнямі. Яны намераны выступіць і ў будучым годзе.

Асноўны актыў усіх культурных пачынанняў у сваім сяле гэта: Рышард Кісялеўскі (старшыня мясцовага гуртка ЗСМП), Васіль Русак, Яўгенія Адамовіч, Рыгор Гарустовіч, Славамір Навіцкі, Данута Кісялеўская і іншыя.

Цяпер моладзь збіраецца рамантаваць клуб.

Летам у Скупаве даволі часта адбываюцца забавы ў „зялёнай" святліцы. Ёсць свой акардэаніст. У клубе моладзь ахвотна арганізуе вясельныя забавы. Тут таксама адбываюцца ўрачыстасці праводзін рэкрутаў у армію.

Кіраўнічка клуба Дануся Кісялеўская вядзе заняткі з вучаніцамі пачатковай школы. Яна вучыць іх рабіць світры, шалікі, шапачкі, сумачкі.

У тутэйшым гуртку вясковых гаспадынь гуртуецца 37 жанчын. Ён арганізуе не толькі кулінарныя курсы, курсы кройкі і шыцця, але нават займаецца вырошчваннем пшаніцы і аўса на ПФЗ-аўскіх зямельных угоддзях. Сабраныя грошы прызначаюць на краязнаўчыя экскурсіі, на пабыўку ў тэатрах і інш. Жанчыны са Скупава працавалі пры пасадцы лесу і зарobленыя грошы перадалі на пабудову помніка савецкім воінам, якія загінулі ў часе вызвалення тутэйшай зямлі. Восенню гэтага года помнік стане на брацкай магіле ў Нараўцы. Цяпер яны рыхтуюцца святкаваць дажынкі ў сваёй гміне. Маюць яны адбыцца ў першую нядзелю верасня. Рыхтуюць мастацкую частку, традыцыйны бохан хлеба, дажынкавы вянок.

Рыхтуецца да іх і моладзь, якая актыўна ўдзельнічае ў акцыі пад лозунгам „Кожны колас на вагу золата".

Тэкст і фота
Я. Цялушэцкага

ХТО Ж УСЁ-ТАКІ АДКРЫЎ АМЕРЫКУ?

Хто адкрыў Амерыку? Тое, што вялікі генуэзец Хрыстафор Калумб не быў першаадкрывальнікам, агульнапрызнана. За некалькі стагоддзяў да Калумба ў Амерыцы пабывалі вікінгі. Але вось новая версія: прафесар археалогіі Гарвардскага універсітэта Бэры Фел лічыць, што Амерыка была адкрыта еўрапейцамі яшчэ задоўга да нашай эры. Робячы раскопкі ў раёне горада Данберы (штат Канектыкут), група археолагаў пад кіраўніцтвам Б. Фела выявіла малюнкі і надпісы на каменнях. На малюнках былі паказаны людзі, якія гандлявалі рознымі вырабамі з мясцовымі індзейцамі. Мяркуючы па надпісах, гэта кельты, прадстаўнікі плямён, якія некалі насялялі Заходнюю Еўропу. Стараннае даследаванне малюнкаў і надпісаў паказала, што яны былі зроблены паміж 1200 і 800 гадамі да нашай эры.

Сардэчныя тайны

рагое Сэрцайка, хаджу я з хлоп- з якім хацела б звязаць сваё цё назаўсёды, але ёсць адно „але“, не дае мне спакою. А вось што: нарачоны вельмі часта п'е, а я мі чулая на гэта, бо з-за майго кі — п'яніцы ўся наша сям'я мае гкае жыццё. Спачатку Віця мне і ıадабаўся, бо да хлопцаў я выбрэд- Калі была малодшай, дык хлоп- было нямала, але ў кожным мне сьці не падабалася. А цяпер мне 24 гады і баюся, каб старой дзеў- не астацца. Ну і прызвычаілася ўжо Віці, кахаю яго, толькі вось аб гэта п'янства ўсе мае планы разбіваюцца. Я ўжо і сварылася няраз, а ён мне за кожным разам гаворыць, што ўжо больш гэта не паўторыцца, але дзе ж там... Нядаўна запрапанаваў жаніцца. Я і ахвотна, але ж піць дык ён не перастаў, таму і адказу я яшчэ яму не дала. Сама не ведаю, што рабіць, таму і звяртаюся да цябе за парадай.

Тося з Беластока

Тося! Здзіўляе мяне вельмі, што ты так старапаненствам перанялася. Ты якраз цяпер маладая, а тыя гады, аб якіх гаворыш, гэта гады ранняй маладосці. Тады дзяўчына не думае яшчэ сур'ёзна аб жыцці, а толькі, каб пагуляць, паскакаць, таму і хлопцаў часта мяняе. А ў тваіх гадах дзяўчына ўжо сур'ёзная і якраз тады павінна выбіраць сабе мужа. А паколькі твой хлопец запіваецца, не спяшайся, пастаў справу цвёрда: ты або гарэлка. Выбірай адно з двух. І вытрывай пры гэтым. Не згаджайся на шлюб, пакуль не ўпэўнішся, што гарэлку пакінуў. Калі з кілішкам не скончыць, пакінь ты яго. Так будзе найлепш.

Сэрцайка

Кансультацыя юрыста

ЫТАННЕ: Ад 1971 г. З. карыстаўся ıавольна з сенажаці В., хоць В. яму днаразова гэта забараняла. У 1975 зе яна звярнулася ў суд і атрымала шэнне аб прымусовым высяленні З. з ıажаці. Судовы выканаўца 3 верасня 75 года выканаў рашэнне. Пасля гэта- В. у судзе патрабуе ад З., каб ён за- аціў за два пакосы сена за кожны ı. З. не хоча плаціць і спасылаецца тое, што за 1971 і 1972 год зайшла ўнасць, а ў апошніх гадах ён фактычна з сенажаці не меў карысці, бо ў 1973-1974 г. часам пасвіў быдла, як і іншыя суседзі, а ў 1975 годзе нават нагой на сенажаць не ступіў. Чаго можа патрабаваць ад З. уласніца сенажаці?

АДКАЗ: З. быў карыстальнікам са злым намерам і таму павінен заплаціць за самавольнае карыстанне з сенажаці і не толькі вартасць карысці, якія меў з сенажаці, але і вартасць сена, якога не сабраў у выніку дрэннай гаспадаркі. Уласніца павінна падаць у суд на працягу года ад дня выканання судовым выканаўцам рашэння, або ад таго дня, калі даўжнік звярнуў зямлю добраахвотна. Таму З. беспадстаўна спасылаецца на даўнасць. Не мае таксама значэння тое, ці З. меў карысць з сенажаці, ці не меў, паколькі ён добраахвотна сенажаці звярнуць не хацеў і самавольна не дапускаў уласніцу да карыстання з сенажаці. З. павінен сплаціць за два пакосы сена за кожны год, адлічыўшы кошты збору сена, бо пры правільнай гаспадарцы павінна быць сенажаць скошана прынамсі два разы.

Вер-не-вер

Сніцца мне, што спаткала я хлопца, з якім калісьці, яшчэ ў маладосці крыху хадзіла. Ён нёс у кошыку грыбы. Грыбы былі вялікія. Я й кажу: „Дай мне адзін грыб, хіба не пашкадуеш грыба былой нарачонай?“ І ўзяла я адзін вялікі грыб, паглядзела і аддала яго яму назад у кошык.

У тую ж ноч снілася мне, што іду я па сходах. Ужо зайшла высока. Алеісці мне лёгка, я зусім не змучана.

І яшчэ адзін сон. Бачу я свайго знаёмага голым. Ён стаіць і апранае кашулю.

Што абазначаюць гэтыя ўсе сны, што прысніліся ў адну ноч.

Вера

Дарагая! Яшчэ не ўсё страчана! І хаця маладосць ваша адплыла, як і ўсё найпрыгажэйшае на свеце, то можаце быць упэўнены, што пераканаецеся наконт прыказкі: „У старой печы чэрці паляць“. Аб гэтым сведчаць вялікія грыбы, якія вы бачылі ў кошыку свайго нарачонага, а асабліва той адзін грыб, які вы ўзялі і ўважліва агледзелі — любоўная страсць, нікуды не падзенешся. Праўда, будзе яна трываць нядоўга, паглядзела і аддала, але на пацеху і тое добра.

А ўсё ж будзе вам добра: ішлі, ішлі высока ўверх і не змучыліся.

Ваш апошні сон пацвярджае першы: яшчэ не ўсё страчана!

Астрон

Як зварыш, так і з'ясі

Стравы з рысу

РЫС З ЗЯЛЁНЫМ ГАРОШКАМ

На 3/4 шклянкі рысу і каля 2 шклянак вады трэба ўзяць лыжку масла ці маргарыну, цыбулю, соль, папрыку, 1 малую баначку зялёнага гарошку, 4 яечкі, зеляніну.

Памыты рыс усыпаць у адмераную колькасць кіпячай вады з тлушчам, дадаць соль і зварыць. Цыбулю дробна нарэзаць, падсмажыць у невялікай колькасці тлушчу, якім можа быць, напрыклад, капчоная грудзінка. Адцадзіць гарошак з соку. Да зваранага рысу дадаць падсмажаную цыбулю, адцэджаны гарошак, крутыя і дробна нарэзаныя яечкі, заправіць па смаку папрыкай і асцярожна, дзвюма відкамі вымяшаць. Пасыпаць зеляніной і, падагрэўшы на невялікім агні, падаваць з салатам, напрыклад, з капусты ці пораў.

КАТЛЕТЫ З РЫСУ І КАПЧОНАЙ ТРАСКІ (ДОРША)

На шклянку рысу даць у два разы больш вады, па смаку соль, лыжку тлушчу, цыбулю, два яечкі, 30 дэкаў капчонай рыбы, перац, зеляніну, лыжку цёртай булкі, тлушч для смажэння.

Зварыць рыс, палову рысу і ачышчаную ад касцей і скуркі рыбу прапусціць праз мясарубку. Да масы дадаць другую частку рысу, падсмажаную на тлушчы цыбулю, жаўткі яечак, заправіць масу па смаку і вымяшаць. З бялкоў збіць пену і зноў вымяшаць з масай. Фармаваць круглыя катлеты, мачаць у цёртую булку і смажыць на разагрэтым тлушчы. Падаваць з соусам, напрыклад, грыбным ці агурковым, з бульбай і салатам.

ЗЯЛЁНАЯ ЗАПЯКАНКА З РЫСУ

На шклянку рысу ўзяць лыжку тлушчу, у два разы больш вады, чым рысу, 25 дэкаў шпінату, 3 яечкі, 4-5 сардэлек, соль, перац, зубок часнаку, цыбулю, 2 лыжкі тлушчу, лыжку цёртай булкі.

Зварыць рыс. Цыбулю падсмажыць разам з часнаком у невялікай колькасці тлушчу. Жаўткі яечак сцерці з астуджаным тлушчам з цыбуляй, дадаць рыс і тушаны, дробна пасечаны шпінат, усё заправіць па смаку і вымяшаць, а ў канцы збіць бялкі і дадаць іх да масы, асцярожна памешваючы. Палову масы палажыць на бляшку, змазаную тлушчам і пасыпаную цёртай булкай. На гэту масу палажыць нарэзаныя без скуркі сардэлькі, накрыць рэштай рысу, падраўняць паверхню, спырснуць тлушчам, запячы. Падаваць з таматным сокам (таматным сокам гэтую патраву звычайна запіваюць).

Гаспадыня

Этнаграфічнае акенца



Былы вадзяны млын у Бобры Малой непадалёк вытокаў ракі Бебжы.
Фота М. Гайдука.

Байцоў для будучага атрада Арлоўскі падбіраў уважліва і вельмі прыдзірліва. Добраахвотнікаў хапала, але толькі лепшыя з лепшых вытрымлівалі экзамен.

Адзін з першых з просьбай залічыць у групу спецыяльнага прызначэння да Арлоўскага звярнуўся высокі чарнявы кавалерыст. Спрактыкаваным вокам Арлоўскі акінуў яго стройную постаць. Пабялелая ад сонца гімнасцёрка з начышчанымі меднымі гузікамі была акуратна, як у бывалага воіна, запраўлена за рэмень, бялюткі падкаўнерык падкрэсліваў загар на твары, нібы хромавыя, ззялі чорным бляскам кірзавыя боты. „Падцягнуты баец“, — у думках пахваліў Арлоўскі кавалерыста.

— Чырвонаармеец Іван Грыцавец, — адрэкамендаваўся кавалерыст.

Прозвішча Грыцавец гаварыла Арлоўскаму вельмі шмат. У памятным 1937 годзе савецкі лётчык Сяргей Грыцавец камандаваў эскадрылляй знішчальнікаў іспанскай рэспубліканскай арміі. Там зямляк Арлоўскага рабіў сапраўдныя цуды, пра яго шмат пісалі ў газетах. Дзіва што: „почырк“ аса Сергіо ведалі не толькі сябры, іспанскія пілоты, але і фашысцкія лётчыкі. Паветраныя піраты з разбойніцкага „Кандора“ баяліся гэтага Сергіо — толькі за адзін дзень ён збіў сем самалётаў, а ўсяго ў небе Іспаніі ім было знішчана трыццаць варожых самалётаў. На Радзіму Сяргей Грыцавец вярнуўся Героем Савецкага Саюза. Пазней з газет Арлоўскі з гордасцю за свайго баявога пабрацімца даведаўся пра подзвіг, які ён здзейсніў на Далёкім Усходзе. Подзвіг быў сапраўдны, бяспрыкладны. У час аднаго з баёў японцы збілі самалёт камандзіра. Паранены, ён выкінуўся на парашуце і прызямліўся на тэрыторыі праціўніка. Да яго ўжо беглі ўзрадаваныя японскія салдаты. Але раптам побач з ім сеў савецкі знішчальнік. З яго выскачыў лётчык і на вачах у ашаломленых японцаў падхапіў парашутыста, пасадзіў яго ў самалёт, імкліва ўзняў машыну ў паветра...

За выратаванне свайго камандзіра Сяргей Грыцавец быў удастоены другой Зоркі Героя. Так герой іспанскага неба стаў першым у нашай краіне двойчы Героем Савецкага Саюза. Усё гэта прамільгнула ў памяці Кірылы Арлоўскага, калі ён пачуў прозвішча Грыцавец. Арлоўскі пачаў падрабязна распытваць Грыцаўца: дзе служыў, ці мае баявы вопыт, адкуль родам, дзе сям'я.

Іван Грыцавец быў не толькі аднавясковец, але і сваяк Сяргея Грыцаўца. 3 верасня 1939 года, адразу ж пасля вызвалення Заходняй Беларусі, паступіў на службу ў міліцыю. Служыў у Баранавічах. Пачалася вайна, і міліцыянер-кавалерыст Грыцавец стаў кавалерыстам Чырвонай Арміі, удзельнічаў у абароне Смаленска і Масквы. Пазней, восенню першага года вайны, стаў байцом АМСБАПа.

Неўзабаве ў Арлоўскага з'явіўся надзейны памочнік — камісар атрада Рыгор Івашкевіч. Равеснік Кастрычніка, Івашкевіч пасля службы ў арміі працаваў у міліцыі, у Чашніках, з першых дзён зноў прыйшоў у армію, удзельнічаў у баях з гітлераўцамі.

У атрад спецыяльнага прызначэння былі залічаны харкаўчанін Васіль Удавічэнка, масквіч Аляксей Блінаў, які пабываў ужо ў тыле ворага. Добрую палову атрада складалі землякі камандзіра, ураджэнцы і жыхары тых мясцоў, дзе ім трэба было дзейнічаць. Як ніхто іншы, Арлоўскі ведаў, якую велізарную карысць атраду, асабліва на пачатку, могуць прынесці байцы, што добра ведаюць мясцовасць, маюць у суседніх вёсках сваякоў і надзейных знаёмых. Менавіта такімі байцамі былі Іосіф Якубоўскі, Сяргей Пятрушка, Сяргей Бусько і тры Іваны — Грыцавец, Тунік і Забаўнюк. Усе яны нарадзіліся і жылі ў Баранавіцкай ці суседняй з ёю — Пінскай вобласці, некаторыя да вайны служылі там у міліцыі, ведалі многіх мясцовых патрыётаў, якім можна было смела давяраць.

Камандзір быў задаволены сваімі байцамі, верыў ім: не падвядуць! Асабліва радаваўся Арлоўскі сустрэчы з Хуста Лопесам, з якім яго звяла і здру-

ТРЫБУНА чытачоў

„Ніва" папулярная

Як пісьманосец я магу сказаць, што ў нас ніводная газета так не папулярная, так не любімая, як „Ніва". Многія чытачы не могуць дачакацца пятніцы, дня, калі найчасцей гэты часопіс на беларускай мове прыходзіць да іх. Людзі горнуцца да сваёй газеты, да сваёй мовы.

М. Панфілюк
Дубічы Царкоўныя

ЦІ НЕ ЗАЙЦАЎ РЭЗЕРВАТ?

Ёсць прыклады ПГР-ы
Буйныя міліянеры,
Безупынна з году ў год
Павялічваюць даход.
Ёсць аднака ж, не на жарты,
Пэгээры ганьбы варты.
Псотнік гэтакі якраз
Гаспадарыць каля нас.
Ён арэ — гара, даліна,
Ці сыпкі пясок, ці гліна,
З вышыні птушкі палёту
Сее попел з самалёта.
Хутка сее, хвала Богу,
На раллю, лугі, дарогу,
Сенажаць, пясок ці гліну,
У заваротах, на хваіну.
Ураджай мае ўсялякі
На сыпкіх пясках й ніякі.
Што найгорша — то ўборка —
Ураджаю доля горка,
Абы-які камбайнеры,
Жнуць высока, не па меры,
Каласочкі не зразаюць,
Чыста зерне рассыпаюць —
На зямельку, замест ў мех.
Ці ж то не злачынства й грэх?
Мабыць старшы ў пэгээры
Даглядаюць но паперы,
Умела чыркаць, меўшы хватку,
Выйдзе ўсё чысцютка, гладка.
На нішто звядуцца страты,
Бы ніхто й не вінаваты,
Ўмела скрыўшы канцы ў воду,
Не віны чакай, нагроду.
А на дзеле? Што ж на дзеле?
Сад садзілі сем нядзеляў
Паставілі агароджу
Драцяную сетку гожу.
Дужа коштаў улажылі,
Зайцаў выгнаці забылі,
Плошчы ля гактароў дзвесце
Гуляй, зайкі, — ёсць што есці!
У агароджы з ўсіх бакоў
Ад сабак і ад ваўкоў,
З розных тутака выгод
Зайцы ўзвысілі прыплод.
Сёння зайчыкаў ў саду
Поўна ў кожнаму раду:
Поўныя гаспадары
Паміж яблынь без кары.
Хто на гэты сад не гляне,
Задае сабе пытанне:
Ці напраўду гэта сад,
Ці на зайцаў рэзерват?
Даражэнькі, вер-не-вер
Ёсць такі ў нас пэгээр.
Гаспадарыць каля нас
Дзе жыву я...

Дзядзька Квас

жыла далёкая Іспанія. Лопес коратка расказаў камандзіру пра свой лёс пасля паражэння рэспубліканскай арміі: быў інтэрніраваны ў Францыі, затым пераехаў у СССР, вучыўся ў партыйнай школе ў Маскве. З першых дзён вайны — у арміі. А цяпер просіць Арлоўскага прыняць яго, Хуста Лопеса, у свой атрад.

— Былы камандзір брыгады іспанскай рэспубліканскай арміі хоча стаць радавым байцом партызанскага атрада? — Арлоўскі зрабіў націск на слове „радавым".

— Пра пасаду і чын я не думаю, — з запалам адказаў Хуста Лопес. — Актыўна, са зброяй у руках змагацца з ворагам — вось да чаго я імкнуся. І я палічу для сябе за вялікі гонар, калі вы, партызан-ас, возьмеце мяне ў свой атрад. Калісьці вы, савецкія людзі, дапамагалі іспанскаму народу ў яго барацьбе з фашызмам. А цяпер, калі бяда прыйшла да вас, я, іспанец, не магу заставацца ў баку ад гэтай барацьбы.

Так былы камандзір іспанскай рэспубліканскай арміі стаў байцом спецыяльнага партызанскага атрада, прызначанага дзейнічаць у тыле фашысцкіх войск на тэрыторыі Беларусі.

(Працяг будзе)

Два клубы, два полюсы

У клубе селяніна ў Дубічах Царкоўных нядаўна пачала працаваць маладая дзяўчына з Тафілаўцаў — Надзя Клімюк. У клубе многае змянілася. Цяпер тут чыста, утульна, многа розных тавараў. У вызначаныя гадзіны клуб заўсёды адкрыты. Свае 42 гадзіны ў тыдзень (столькі службова вызначана) Надзя шчыра працуе, працуе нават больш, калі трэба. Усе жыхары задаволены новым працаўніком.

★

А вось такі самы клуб ёсць у вёсцы Чэхі Арлянскія. Ды становішча тут адваротнае. Балаган, брудна, няма тавараў. „Службовыя" гадзіны тут 2-3. І парадку няйначэ!

М. Панфілюк

Хто гуляе ў „Прыгранічнай"?

Аб чаромхаўскім рэстаране „Прыгранічная" напэўна чулі многія чытачы, а ёсць шмат і такіх, якія ў ім пабывалі. Таму я адразу пачну ад канкрэтнай справы, якая хвалюе мяне ад нейкага часу.

Каму служыць „Прыгранічная" ў Чаромсе? Гэтае пытанне чуваць усё часцей сярод жыхароў пасёлка. Хто часцей заглядае ў рэстаран, адкажа адразу: аматарам піва і п'яніцам, якія шукаюць прытулку. Мо няпраўда? Праверце самі. Найлюдней тут заўсёды ў дні зарплат. Ужо каля абеду шнурочкам цягнуцца сюды першыя наведвальнікі. Яны — чыгуначнікі. Каля гадзіны 14-ай у рэстаране, як у мурашніку. У першай зале месца не знойдзеш. Затое ў другой, дзе забаронена піць алкаголь, хоць раскладайся на крэслах. Афіцыянткі галовы трацяць, не паспяваюць усіх абслужыць. З усіх бакоў нясуцца галасы: „Кельнер, піва, кельнер, сотку". З гэтага шуму нейкі голас загучэў: „...Рэвела бура, гром грымеў", другі памог і ўжо ёсць канцэрт. А чалавеку, які чакае абеда, аж вушы пухнуць ад гэтага. І афіцыянткі не дачакацца, бо яны ж абслугоўваюць у першую чаргу крыкуноў.

Толькі ўвечары, перад закрыццём рэстарана ўсё сціхае. Зала пусцее. Часам даводзіцца афіцыянткам каго-небудзь „лябёдкай" падымаць. Ды гэта дробязь. І так праходзіць гарачы дзень у „Прыгранічнай", а пасля трэба вывозіць з яго фуру пяску, смецця і акуркаў. Такіх гарачых дзён у рэстаране трапляецца мала — 4-6. У астатнія — цішыня. І так з месяца ў месяц. На тры залы рэстарана — дзве амаль не выкарыстаны.

Ці ж гэта не рэзерв кляшчэлеўскім гандлёўцам? Многія прапануюць арганізаваць тут у кожную суботу танцы, так званыя „дансінгі". На маю думку, прапанова рэальная. Толькі праўленне кляшчэлеўскага ГС-у павінна ёю бліжэй зацікавіцца.

Ул. Сідарук

Можна шыю скруціць

Ад ст. Чаромха ў Кляшчэлі ёсць прыгожая дарожка з непраезднымі... ямамі. Хто дарогу ведае, пралом абміне. А чужы чалавек можа шыю скруціць, асабліва ноччу. Няма тут ніякіх знакаў на дарозе.

Найгорш папсавана дарога каля вёскі Чаромха і зараз за Чаромхай у напрамку Кляшчэляў. Тут, напрыклад, 12 ліпеня г.г. па прычыне вялікай скорасці мотавеласіпедыст, наехаўшы на пралом, згубіў свайго сябра. Добра, што на гэтым скончылася.

Думаю, што гр. М. Ваврусевіч з Кляшчэляў, адказны за стан дарог у раёне Кляшчэляў і Чаромхі, павінен зацікавіцца гэтай справай. А калі ён не ведае аб праломах на дарозе, няхай пытае ў кляшчэлеўскіх шафёраў. Яны яму скажуць.

(ус)

Не хапае часцей

Цяпер многія маюць уласныя матаролеры. І вельмі задаволены гэтым сродкам транспарту. Аднак з часцямі да іх — адна бяда. У розных прамысловых крамах іх не хапае. І калі на рынку ў спекулянта намнога даражэй не купіш, дык нідзе не дастанеш.

Многія пакуплялі савецкія матаролеры „Вэрховіна". Яны добрыя, але нічога вечнага няма. Ды й да іх запасных часцей не купіш. Калі хто сам не прывязе з СССР, што рабіць? Чаму так яно?

М. Панфілюк

Машына замятае

Месяц жнівень 1976 года — гэта важная дата ў жыцці горада Бельска. Гарадское камунальнае прадпрыемства купіла аўтамабіль для замятання вуліцы. Да гэтага часу такіх машын у Бельску яшчэ ніколі не было. Усе вуліцы трэба было замятаць венікам.

Цяпер у кожны працоўны дзень гэтая машына кружыць па вуліцах горада і выконвае сваю працу. Пакуль што чысціць яна галоўныя вуліцы, на якіх ляжыць асфальт. І вуліцы горада сталі чысцейшымі і ўвесь горад прыгажэйшым.

Мікалай Няплоха

Ці будзе што ў Семяноўцы?

Свайго часу вёска Семяноўка ў гміне Нараўка гучэла песнямі і музыкай. Вядомы былі далёка семяноўскія спевакі. Ды ў апошнія гады культурнае жыццё ў вёсцы заглохла. Не працуе клуб, ані святліца. Ціха. Хуліганы нішчаць апошняе.

Клуб у Семяноўцы патрэбны. Моладзь хоча спяваць, танцаваць, выступаць. Многія дзеячы многіх арганізацый выступалі з прапановай адкрыць клуб, адрамантаваць святліцу. Грамадскім чынам зрабілі б многа і самі жыхары вёскі.

А цяпер семяноўская моладзь збіраецца па хатах. Два браты Матысюкі — Ян і Мікалай жывуць у маляўнічым гаі высокагонкіх бярозак на хутары. Хлопцы — спецыялісты на ўсе рукі. Таксама дасканала іграюць — адзін на акардэоне, другі — на перкусіі. Вядомы ў Семяноўцы і Шыманюк Аляксандр — першакласны гітарыст. Малады гэты эстрадны калектыў вядомы стаўся далёка за вёску Семяноўка, як беларускія песняры. Прыгожа спяваюць, іграюць, аж душа рвецца. Іграюць у клубах і святліцах навакольных вёсак. А Семяноўка — вялікая вёска, з прыгожай моладдзю, добрымі гаспадарамі, а да клуба шчасця не мае.

(вб)

Сяляне яго цэняць

Больш, як год таму назад Іван Алесюк з вёскі Рудуты, гміна Орля, купіў сабе ў мясцовым сельгасгуртку стары трактар. Адрамантаваў яго. І сёння не нацешыцца стальным канём, а таксама не нацешацца жыхары вёскі. Бо Іван Алесюк нікому не адмовіць, калі трэба выканаць нейкую працу сваім трактарам.

Вёска Рудуты вялікая, аднак кожнаму гэты чалавек нешта ўжо рабіў на полі, а пераважна ён косіць травы і жыта. За сваю паслугу бярэ вельмі танна. І жыхары вёскі высока цэняць гэтага чалавека. Кажуць: каб не ён, цяжка было б. Сам Іван Алесюк добры гаспадар, і многія бяруць з яго прыклад.

М. Панфілюк

У нас і бруку няма

„Ніва", я сістэматычна чытаю твае артыкулы. Усё мяне цікавіць. У апошні час я звярнула ўвагу на тое, што ў некаторых вёсках выступае праблема з пракладкай тратуараў. Я гэтым вёскам зайздрошчу таму, што ў нашай вёсцы Кашалі не толькі ніхто не думае пра тратуары, а нават няма каму дарабіць брук, які быў распачаты не два гады таму назад, а можа трыццаць. Адзін канец вёскі зусім без бруку. Летам людзі гразнуць у пяску, у час ветру ўкладаюцца пясчаныя горы, як са снегу. Вецер задувае вокны пяском. А вуліца ў гэтым канцы вёскі даволі шырокая. Знайшлося б месца і на брук, і на тратуары.

Веру, што людзі не шкадавалі б далажыць і ўласнай працы. Толькі няма каму паклапаціцца, арганізаваць людзей. А, здаецца, і гміна Орля так блізка. Не аднаму працаўніку гміны даводзілася гразнуць у нашым пяску, і пасол з Орлі не раз тапіўся ў ім, і радныя з нашай вёскі ў ім купаюцца, і рабочыя кафлярні штодзённа цягнуць у руках свае веласіпеды і матацыклеты праз гэтыя 400 метраў пясчанай вуліцы. А калі праедзе машына, людзі закрываюць вочы.

Можа ты, дарагая „Ніва", раскрыеш на гэта вочы каму трэба. Калі адпаведныя ўлады не бачылі, не звярнулі на гэта яшчэ ўвагі, просім няхай пройдуцца вуліцай у Кашалях.

Сталая чытачка „Нівы"
з вёскі Кашалі каля Орлі

БЕЛЬСКАЯ ВУЛІЦА ГАГАРЫНА

У Бельску многа вуліц, якія патрабуюць перабудовы. Адна з іх асабліва дрэнная, а называецца яна вуліцай Ю. Гагарына. Гэта важная вуліца, на ёй заўсёды вялікі рух, тут змяшчаюцца многія бельскія прадпрыемствы, сюды пастаянна ідуць людзі.

На вуліцы ляжыць брук, аднак ён няроўны, многа калдобін, перакопы. Летам у час пасухі пасля праезду машыны, падымаецца вялікі туман пылу, а пасля дажджу стаіць вада і робіцца балота. Добра было б адрамантаваць гэтую вуліцу хоць бы з боку чыгункі.

Мікалай Няплоха

БАБУЛІ 80 ГОД

У гміне Дубічы Царкоўныя на хутары Клякава жыве бабуля — Анна Рашчэнка, 80 год. Умовы яе жыцця вельмі цяжкія. Спрацаваная, знішчаная цяжкім жыццём бабуля сядзіць ля акна сваёй маленькай хаткі і ўсё выглядае, ці не прыдзе грамадскі апякун — адказны працаўнік гміны.

Ужо многа разоў абяцалі ёй, што прыедуць, дапамогуць, прызнаюць грашовую дапамогу. Не спяшаюцца. Солтысу думаецца таксама, што заняцца гэтай жывой душой — не яго справа. Варта было б яшчэ раз успомніць бабуліны слёзы. А прапанову гэтую кірую начальству гміны Дубічы Царкоўныя.

Крапіва

ДЗЕ КРАСУЕЦЦА ЧАРТАПАЛОХ

Можа калі вам пападзе ехаць дарогаю Бабікі-Сухінічы-Драгле. Дарогу будавалі некалькі год, а ўжо два гады, як закончылі пабудову. Гэты шлях, званы жвіроўкай, каштаваў многа мільёнаў злотых. Людзі чакаюць, каб хутчэй пусцілі па дарозе аўтобус. Але пакуль што паабапал дарогі вы ўбачыце іншыя цуды і дзівы. Растуць маладыя таполі, пакрыўленыя ветрам, бо садзячы, іх не прывязалі да калкоў. Шмат паламалася. Больш за ўсё, аднак, кідаецца ў вочы растучы ля дарогі лес чартапалоху і ўсялякага пустазелля. Калі чартапалох даспее, пры малым ветрыку ўзнімаецца ўгару хмара насення і плыве на культурнае поле гаспадароў, дзе з вясною будзе дасканала расці. А як усцешыцца гэтае паскудства, калі трапіць на палоску такога гаспадара, які не дбае, каб зрабіць апырскванне...

Не ведаю, ці на гэтай дарозе ёсць дарожнік, які б не дапускаў даспяваць чартапалоху і пагуляў бы над ім з касою? Калі не хапае такога дарожніка, дык гміна павінна загадаць гаспадарам — кожнаму насупраць сваёй палоскі выкасіць пустазелле.

Ніяк

НОВЫ ДЗІЦЯЧЫ САД У БЕЛЬСКУ

У Бельску на Абазовай вуліцы ў пачатку верасня быў адкрыты новы прасторны і вялікі дзіцячы сад. Пабудавалі яго ў 1976 годзе. Два комплексы будынкаў спалучаны прахадным будынкам. Прасторны панадворак, шмат зелені. На панадворку многа цацак і прыладаў для гульні. Весела тут дзецям.

Мікалай Няплоха

У АДКАЗ НА НАШУ КРЫТЫКУ

ДА ПУБЛІКАЦЫІ: „ЯК ПАДСЯВАЮЦЬ УГНАЕННІ? „Ніва", № 20 ад 16.V.76 г.

Адказвае: Wojewódzki Związek Kółek Rolniczych w Białymstoku.

W odpowiedzi na skargę mieszkańców wsi Kaniuki, zamieszczoną w czasopiśmie „Niwa" Nr 20 z dnia 16.V.76 r. dot. wapnowania łąk, Wojewódzki Związek Kółek Rolniczych w Białymstoku, po uzyskaniu wyjaśnień ze Spółdzielni Kółek Rolniczych Zabłudów i Urzędu Miasta i Gminy Zabłudów informuje, że wapnowanie zostało wykonane kompleksowo pod nadzorem przedstawicieli z trzech instytucji (SKR Zabłudów, UM i Gminy Zabłudów i WZSP Białystok). **Do Dyrekcji SKR nie wpłynęła bezpośrednio żadna skarga dot. zmniejszenia względnie zwiększenia dawek wapnowania na 1 ha.**

Wapnowanie wykonano na terenie podmokłym i zanotowano kilkakrotne ugrzęźnięcie sprzętu, jednakże szkody wyrządzone z tego powodu usunięto na koszt SKR poprzez wałowanie.

Z uwagi na powyższe, podnoszone w skardze zarzuty nie są uzasadnione.

Wiceprezes Zarządu WZKR
inż. Krystyna Zajkowska

„Niwa" — Tygodnik RSW „Prasa—Książka—Ruch". Skr. poczt. 149. 15-950 Białystok. TELEFON 2-32-41. Wydawca Przedsiębiorstwo Wydawniczo-Kolportażowe RSW w Białymstoku. PRENUMERATA: Oddziały „Ruchu", urzędy pocztowe i listonosze. Indeks 36911/36671.

Школьны дэтэктыў

— Тата! — крыкнуў, убягаючы Жан, круглатвары, сімпатычны хлопчык. — У нас заўтра бацькоўскі сход!

— Які сход? — спытаў бацька, ды сын ужо імчаўся па лесвіцы на панадворак, дзе яго чакаў футбольны матч з сябрамі, такімі ж гультаямі, як і ён сам.

— Пайдзі, пайдзі, — сказала маці, — і пагавары з настаўнікам сур'ёзна. Мне здаецца, ён залішне прыдзіраецца да нашага дзіцяці.

На другі дзень у шэсць вечара бацька і Жан уваходзілі ў школу.

— Добры дзень, мсье Рэнэ, — ветліва сказаў настаўнік. — Я запрасіў вас, каб пагаварыць аб вашым сыне. Жан дрэнна вучыцца. Але гэта не ўсё. На жаль, ён яшчэ і несумленны. У часе апошняй кантрольнай працы па гісторыі ён спісваў у свайго суседа.

— Не можа быць, — разгублена сказаў мсье Рэнэ.

— Але гэта факт. Зрэшты, пераканайцеся самі. Вось дзве кантрольныя працы. Вам няцяжка будзе выявіць аднолькавы адказ на першае пытанне: „Хто ўступіў на трон пасля Напалеона?" „Людовік XVIII".

— Але, пане настаўнік, гэта яшчэ не доказ, што спісаў мой сын. Адказ правільны, таму зусім натуральна, што абодва хлопчыкі аднолькава адказалі на пытанне.

І бацька не без гордасці паглядзеў на Жана, які стаяў побач, апусціўшы галаў.

— Лагічна, лагічна, аднак паглядзім на другое пытанне: „Куды быў сасланы Напалеон?" У абедзвюх кантрольных працах быў адзін і той жа адказ: „На выспу Ір".

— Тааак... — працягнуў бацька. — Недакладна, вядома... Але не маглі б вы, пане настаўнік, дапусціць, што зусім выпадкова абодва хлопчыкі аднолькава памыліліся? Дык такое можа здарыцца, ці не праўда?

— Магчыма, зусім магчыма, хацелася б верыць. Але было яшчэ і трэцяе пытанне: „Калі памёр Напалеон?" Сусед вашага сына адказаў: „Не ведаю". А цяпер прачытайце, што напісаў ваш сын: „А я тым болей".

Эрве Негр
(Францыя)



НІЎКА





Без слоў.

„ФІЛОСАФ" ЯСЬКА

Яшчэ трымае
У роце соску,
А разважае
Па-філасофску:

— Не будзе кашы —
Пад'ем заціркі.
Не будзе цэла,
Дык будуць дзіркі.

Як што не вечна,
То падзярэцца.
Калі халодна,
То след пагрэцца.

— Ну, хопіць, годзе,
Гадуйся, сыне.
Далёка пойдзеш,
Калі не спыняць!..

Р. Яўсееў

ЛОГІКА

Жонка мужу:
— Не разумею, як можна праводзіць усе вечары ў піўной!
— Не разумею, не разумею! Навошта ж гаварыць аб справах, якіх ты не разумееш?

УМЕЛАЯ ЖОНКА

— Твая жонка ўмее варыць?
— Варыць дык яна ўмее, толькі я не ўмею есці тое, што яна варыць.

ПАЛАХЛІВЫ ТАТА

— Мой тата вельмі палахлівы.
— Чаму ты так думаеш?
— Калі мы ідзём па вуліцы, ён заўсёды трымаецца за маю руку. Баіцца, што заблудзіцца!

У ГАСЦЯХ У БАГАТАГА

Пакумаўся бедны селянін з багатым. Калі б не завітаў багаты да беднага ў госці, бедны апошнюю курыцу заража, а ўгосціць кума.

Нейк і беднаму давялося пабываць у той вёсцы, дзе жыў яго багаты кум. Таксама мусіў багаты запрасіць беднага да сябе ў госці. „Хоць паабедаю добра", — думае бедны (быў ён галодны) і пайшоў да кума з ахвотай.

Сядзяць яны гадзіну, сядзяць другую, а кум абедаць не дае, толькі курыць сваю люльку ды частуе кума якімсьці смярдзючым тытунём.

Бачыць бедны, што і сонца ўжо да вечару хіліцца, і есці хочацца, аж у вачах рабее, ды й кажа:
— Пайду я, куме, дадому.
— Сядзіце, куме, закурвайце. Дзень цяпер вялікі!
— Дзякую шчыра. Я ўжо пакурыў, пара й дадому.
— Ваша справа, куме, — кажа багаты, — заходзьце часцей. І куму бярыце з сабою.
— Дзякую, дзякую, кума некурашча, — сказаў бедны ды й пайшоў з двара.

...Быў гумарыстам, але заўсёды трымаў пачуццё гумару ў сакрэце.

НА ШЫРОКІМ СВЕЦЕ

У забароненым для стаянкі месцы спыняецца старэнькі „рэно". Тут жа з'яўляецца паліцэйскі.
— Гэта ваша машына, мсье?
— Мая.
— Пяцьдзесят франкаў.
— Цудоўна! — радасна ўсклікае ўладальнік машыны. — Нарэшце яшчэ дзесяць франкаў і можаце забіраць яе!

✲

Дама ўваходзіць у зброевы магазін і просіць паказаць ёй добры пісталет.
— Вам для абароны, мадам?
— Не, для абароны я найму адваката.

✲

Шатландзец сустрэў чорта ў сваёй бібліятэцы і пытае, як ён сюды трапіў.
— Праз камінную трубу.
— Шатландзец падымае тэлефонную трубку.
— Стой, не клікч сьвяшчэнніка, прашу цябе! — узмаліўся чорт.
— Ды я і не думаю яго клікаць, я толькі хачу папярэдзіць трубачыста, каб ён сёння не прыходзіў.



— А ці нельга звязацца з генералам крыху пазней, а то перадаюць цудоўны канцэрт!

З жыцця радавога Кучкі

ШТО ЗАГАДАЕЦЕ

Знаёмячыся з новым папаўненнем, старшы сяржант вышукоўваў сярод маладых салдат спецыялістаў. Ён запісваў сабе ў блакнот: „столяр", „маляр", „муляр" і г.д.
— А вы, салдат, што ўмееце рабіць? — спытаў ён Кучку.
— Што загадаеце, грамадзянін старшы сяржант, — адказаў той.

— Усё-ткі, Ваня, я не рыбак, а грыбнік.



ПЕСНІ ПА ЗАЯЎКАХ

Па просьбе Міхала Зажэцкага, Яна Вавульскага з Малісаў, Анкі, Надзі і Якуба Нікіцюкоў са Ступнік, Весека Мартынюка і Лявона Апалінскага з Паўлаў, Ірэны Несцярук з Дубіч Царкоўных змяшчаем песню

Kapitańskie tango

słowa: Anna Brzozowska
muzyka: Adam Skorupka
śpiewają Alibabki

Wszystkie morza, oceany
Opływają wszerz i wzdłuż
Porty świata ich witają
Twardych ludzi słonych wód.
Ech, fantazja marynarska
Co w zadymce mew
W słonej mgle i pełnym szkwale
Bierzesz morski chrzest.

Kapitańskie tango
Z torsem w paski, miną hardą
Z fajką w zębach, długą brodą
Przesiąknięte morską wodą.
Kapitańskie tango
Niespokojne przed wyprawą
Znów tęsknota zaćmi oczy
Długich, morskich, smutnych nocy.

Czy to dzień, czy noc sztormowa
Pod sklepieniem obcych gwiazd
Bagatelką mórz otchłanie
Monotonia ciągłych wacht.
Marynarze lwom podobni
Gdy ich wita dom
Tracą zwykłą swą zuchwałość
Skąd ta zmiana, skąd?

Kapitańskie tango...

КУРЁЗЫ

БОЛЬШ ЦЯРПЛІВЫ

27 гадзін 33 мінуты 2,2 секунды — такі час паказаў 29-гадовы Т. Рынел з Крайстчэрча, які стаў цяпер сусветным рэкардсменам па... ляжанню на цвіках. Папярэдні „рэкорд", які належаў аўстралійскаму аматару „востраканцавых адчуванняў", палепшан на 2,2 секунды.

ПАМЫЛКА ПАДВЯЛА

Да іспанскага футбольнага арбітра Ніколаса Гарсіа перад матчам паміж камандамі „Алісантэ" і „Арыхуэл" падышоў невядомы сіньёр і ўручыў 180 тысяч песет. Умовы: „арганізаваць" перамогу „Арыхуэла". Але, як ні стараўся суддзя, футбалісты „Алісантэ" перамаглі з лікам 3:0. Тады невядомы прыйшоў да Гарсіа дадому і запатрабаваў вярнуць грошы назад. Грошай не аказалася, і суддзя паабяцаў прыслаць сіньёру распіску. Але памылкова накіраваў яе ў судзейскую калегію. Гарсіа быў дыскваліфікаваны на 25 гадоў.

„...СЫГРАЦЬ ШТО-НЕБУДЗЬ ТАКОЕ"

Начальнік мюнхенскай паліцыі Шрайбер збіраецца на пенсію. Калі журналісты спыталі, чым шматвопытны дэтэктыў зоймецца цяпер, ён адказаў, што хацеў бы паспрабаваць свае сілы ў кіно. Інтэрв'юэры былі перакана볼ы, што Шрайбер марыць аб ролі... камісара паліцыі, які ўсё бачыць і ўсё ведае. „Зусім не, — парыраваў Шрайбер. — Мне хацелася б сыграць што-небудзь такое..." І затым удакладніў, што яго спакушае роля „гангстэра або любога іншага злачынцы".

Які цудоўны гэты свет у дзень палучкі!